КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 32 (255) ◂ 2 верасня ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час

**ЗАБЫТЫ ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ**
Паміж адсутнасцю стабілізацыі на валютным рынку і расколам грамадства на першы погляд няма непасрэднай сувязі, але толькі на першы погляд
Стар. 4

**СНЫ І ПАРАЗЫ АЛІМПІЙЦА**
Трохразовы алімпійскі чэмпіён Уладзімір Парфеновіч сходу і ўшчэнт разбурае міф, што спартоўцы толькі і могуць размаўляць пра свае дасягненні
Стар. 6

**ПАСЛЯ ТРЫПАЛІ**
Стар. 13



**КАМАНДАНТЭ КАМІЛА**
Стар. 12

ISSN 2218-2144

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ЛЕАНІД ЗЛОТНІКАЎ**
Нарыс Аляксандра Тамковіча з цыклу «Лёсы»

▸ З НАГОДЫ

# КАНЕЦ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ МЯСАРУБКІ

Сяргей КАРОЛЬ

**Дваццаць гадоў таму, адразу пасля путчу, Барыс Ельцын паведаміў паслу ЗША, што ў самыя змрочныя часы перавароту ён падтрымліваў настрой слуханнем запісаў Элвіса Прэслі. Амерыканскі рок наўрад ці слухаюць сёння ў палацах вертыкалі Беларусі, а калі б слухалі, то, напэўна, там гучаў бы запіс гурта «Дорз» «Сябар, гэта канец».**




## Такая простая мадэль

Чытачы маіх артыкулаў памятаюць параўнанне беларускай эканамічнай мадэлі з мясарубкай — з усходняга боку ў яе укладаюць «мяса» (нафту, газ, дэталі), а з заходняга выходзіць «фарш» (бензін, хімічныя тавары, МАЗы і трактары). Акрамя бензіну, амаль усе прадукты накіроўваюцца зноў на Усход.

Індэкс залежнасці ад знешняга гандлю Беларусі — абарот знешняга гандлю да ВУП — у 2011 годзе дасягнуў 150%. Больш за 75% эканомікі Беларусі працуе на экспарт. Унутраны рынак Беларусі, пры мізэрных заробках мясцовага насельніцтва, не ў стане стварыць попыт, які патрэбны, каб забяспечыць працай чатыры з паловай мільёны чалавек, занятых у экспартна-імпартным індустрыяльным комплексе краіны.

Экспартна-імпартная мадэль не ўнікальная — шмат маленькіх краін дасягнулі вялікіх поспехаў перарабляючы імпартныя матэрыялы ў спажывецкія ці прамысловыя тавары (напрыклад Сінгапур ці Ганконг, а сярод суседзяў — Нідэрланды, Бельгія і Эстонія). Але што адрознівае гэтыя эканомікі ад Беларусі, дык гэта іх станоўчае гандлёвае сальда, пры тым, што яны плацяць сусветныя цэны за нафту. Інакш кажучы, паспяховая імпартна-экспартная мадэль атрымлівае за экспарт больш, чым плаціць за імпарт.

Ва ўмовах глабальнай канкурэнцыі, пры сусветных коштах на сыравіну, беларуская мадэль не мела б аніякіх шансаў — гандлёвае сальда склала б як мінімум 15 мільярдаў долараў у год, фінансаваць гэта было б немагчыма. Але нават і пры энергетычнай датацыі амаль у палову кошту, беларуская мясарубка рэгулярна губляла ў сваёй вантробе эканамічнае «мяса», год за годам ствараючы адмоўнае гандлёвае сальда. Як адзначыў у «НЧ» Канстанцін Скуратовіч, так было ў 1998 годзе, гэтак сама і цяпер, з той, аднак, розніцай, што і экспарт, і імпарт, і сальда павялічыліся ў дзясяткі разоў. А з тым і чорная дзірка.

А тут і Расія прынцыпова змяніла тактыку — фактычна ўвяла эканамічныя санкцыі, амаль скасаваўшы да 2010 года субсідыі на нафту. У выніку мясарубка амаль спынілася. Потым, праўда, згодна снежаньскай беларуска-расійскай дамове, кошты на нафту былі зніжаныя, але ўводзіўся экспартны падатак, які Мінск павінен быў пералічваць у Маскве. Гэта крыху нармалізавала гандлёвы баланс, аднак сітуацыю з валютай не палепшыла. Атрымалася ілюзія дапамогі: мясарубка працягвала працаваць, але і чорная дзіра павялічвалася.

Замест рэканструкцыі дзіравай мясарубкі, кіраўніцтва краіны запіхвала ў яе ўсё больш мяса, нягледзячы на тое, што дзірка ўсё павялічвалася. Чаму ж не — ВУП краіны рос на 7% у год. Раслі заробкі, і пацяху большасць беларусаў прызвычаілася думаць, што вынайшлі сапраўдны эканамічны цуд, свабодны ад законаў гравітацыі.

Але чым далей, тым усё больш мяса паглынала чорная дзіра. Без аддачы. Штогадовае адмоўнае сальда, асабліва тое, што ідзе не ад інвестыцый у вытворчасць, а проста ад браку эфектыўнасці, трэба неяк фінансаваць — пакрываць розніцу паміж грашыма за экспарт і коштамі імпарту і перапрацоўкі — уліваннямі замежнага капіталу або крэдыту. Капітал — гэта значыць, наўпроставыя інвестыцыі — у Беларусь ніколі не ішоў, бо капіталісты разумелі, што на самай справе ўяўляў беларускі эканамічны цуд. А вось крэдытаў да нядаўняга часу хапала.

Да 2008 года крэдыт меў тры формы — ад пастаўшчыкоў камплектуючых, ад замежных банкаў прадпрыемствам і ад замежных банкаў беларускім банкам. Пры гэтым, што вельмі небяспечна, крэдыт быў кароткатэрміновым, а значыць, кожныя шэсць-дванаццаць месяцаў яго трэба было аднаўляць.

Падчас буму, калі глабальныя банкі (такія, як, у прыватнасці, RBS) давалі крэдыты поўным банкрутам, іх спраўна і аднаўлялі, як прадпрыемствам, так і банкам Беларусі. Цікава, што сам RBS зрабіўся адным з буйнейшых прыкладаў стратных інвестыцый і быў уратаваны ад банкруцтва толькі ўрадам Брытаніі.

Падчас крызісу ўсе тры крыніцы моцна скараціліся. Іх даводзілася замяняць крэдытам дзяржаўным — ад МВФ, ад Расіі і праз выпуск еўрабондаў, што гарантаваў той жа RBS. Але беларускія кухары не толькі не спынілі мясарубку, а нават павялічылі яе абароты — на 2010 год аб'ём гандлю вырас на 20% у параўнанні з 2009 годам, а на чэрвень 2011-га — аж на 53%. Мясарубка стала губляць яшчэ больш «мяса» — кошт перапрацоўкі імпарту ў экспарт значна павялічыўся пасля перадвыбарнага падвышэння заробкаў, унутраных крэдытаў і раздачы грошай на папуліцкія праекты.

Працяг на стар. 5 ▸

ВЫБУХ

# СУД ПРЫЗНАЧАНЫ

**Праз два тыдні, 15 верасня, у Вярхоўным судзе Беларусі пачнецца разгляд справы аб выбуху на станцыі мінскага метрапалітэна «Кастрычніцкая» ў красавіку гэтага года. Судовы працэс будзе адкрыты.**

Справа складаецца з 550 тамоў. Абвінавачваюцца двое грамадзян Беларусі. Дзмітрыю Канавалаву інкрымінуецца здзяйсненне злачынстваў, прадугледжаных часткамі 1, 2, 3 артыкула 289 (тэрарызм), часткамі 2, 3 артыкула 295 (незаконныя дзеянні ў дачыненні да агністрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў), часткамі 2, 3 артыкула 339 (хуліганства), часткай 2 артыкула 218 (наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне маёмасці), часткай 1 артыкула 14 (замах на злачынства) КК Беларусі.

Улад Кавалёў абвінавачваецца ў здзяйсненні злачынстваў, прадугледжаных часткай 6 артыкула 16 (дапамога ў злачынстве), часткай 3 артыкула 289 (тэрарызм), часткай 3 артыкула 295 (незаконныя дзеянні ў дачыненні да агністрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў), часткамі 2, 3 артыкула 339 (хуліганства), часткай 2 артыкула 218 (наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне маёмасці), часткай 2 артыкула 405 (укрывальніцтва злачынстваў), часткамі 1, 2 артыкула 406 (неданясенне аб злачынстве).

Крымінальная справа аб тэрарыстычным акце ў мінскім метро была накіраваная ў Вярхоўны суд Беларусі 4 жніўня.

11 красавіка на станцыі мінскага метро «Кастрычніцкая» ў Мінску прагрымеў выбух, у выніку якога загінулі 15 чалавек, каля 200 пацярпелі.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# АБАРАНІЦЬ ЗМІТРА ДАШКЕВІЧА

Генадзь КЕСНЕР



**Сітуацыя з лідарам зарэгістраванай у Чэхіі міжнароднай моладзевай арганізацыі «Малады фронт» Змітром Дашкевічам, які адбывае двухгадовае пакаранне ў Горацкай калоніі агульнага рэжыму, выклікае вялікую заклапочанасць у блізкіх і сяброў палітвязня, а таксама ў праваабаронцаў.**

Паводле апошняй інфармацыі, якая трапіла да паплечнікаў палітыка, у дачыненні да Дашкевіча ўжываюцца катаванні, а самому вязню пагражае новы крымінальны артыкул.

Як паведаміла на прэс-канферэнцыі ў Мінску намесніца старшыні МФ Наста Палажанка, 24 жніўня адвакату Дашкевіча атрымалася ўбачыцца са сваім мандантам, хоць да таго часу абаронцам ажно пяць разоў адмаўлялі ў магчымасці такой сустрэчы. У той жа дзень стала вядома, што маладафронтавец больш за восем разоў падпадаў пад адміністратыўныя спагнанні. «Зміцер сказаў адвакату, што рапарты на яго складаюцца шляхам розных правакацыяў, гэта робіцца для таго, каб завесці на яго новую крымінальную справу паводле артыкула 411 Крымінальнага кодэкса, а гэта можа пацягнуць павелічэнне тэрміну зняволення ад года да двух», — падкрэсліла намесніца старшыні МФ.

Апроч таго, па словах Палажанкі, нягледзячы на тое, што размова з адвакатам адбывалася праз тэлефонны канал праз шкло і ў прысутнасці прадстаўніка адміністрацыі папраўчай калоніі №9, Дашкевіч змог паведаміць, што намеснік начальніка па аператыўна-рэжымнай працы Аляксандр Лапатка забараніў маладзёну спаць уначы, пасля чаго загадаў ісці на працу. З прычыны фізічнай слабасці Зміцер адмовіўся гэта рабіць, за што чарговы раз апынуўся ў карцары.

Да таго ж, стала вядома, што тэмпература ў штрафным ізалятары, у карцары, у памяшканні камернага тыпу, дзе знаходзіцца Дашкевіч, апускаецца ніжэй неабходнага. «Спаць у такіх умовах проста немагчыма, праз кожныя пятнаццаць хвілін чалавек мусіць уставаць і адціскацца ці рабіць іншыя фізічныя практыкаванні, каб сагрэцца», — распавёў кіраўнік асветніцкай установы «Платформа» Андрэй Бандарэнка, які сам яшчэ нядаўна быў вязнем, але потым суд яго апраўдаў.

Па словах Бандарэнкі, у дачыненні да Дашкевіча было парушана адно з галоўных канстытуцыйных правоў — права на абарону. У сваю чаргу, Наста Палажанка падала ў Генеральную пракуратуру заяву з патрабаваннем прыцягнуць да крымінальнай адказнасці асобаў, якія вінаватыя ў парушэнні правоў і свабод грамадзяніна Беларусі Змітра Вячаслававіча Дашкевіча.

Тым часам, Дэпартамент выканання пакаранняў пры МУС Беларусі абвяргае факты супрацьпраўнага абыходжання са Змітром Дашкевічам у Горацкай калоніі № 9. «Пакаранне ў дачыненні да асуджанага Дашкевіча Зм. В. выконваецца ў дакладнай адпаведнасці з патрабаваннямі крымінальна-выканаўчага заканадаўства. Ваша здагадка пра яго збіццё надуманая і не адпавядае рэчаіснасці», — заявіў начальнік ДВП МУС Аляксандр Барсукоў. Ці пагодзіцца правесці праверку Генпракуратура, каб пацвердзіць альбо абвергнуць словы спадара Барсукова, пакажа час.

МІРНЫ АТАМ

# ЗНОЎ ХВАЛЯ ТРЫВОГІ

Вольга ХВОІН




**Актывісты ініцыятывы «Астравецкая атамная — гэта злачынства» накіравалі адкрыты зварот на імя старшыні Канстытуцыйнага суда і генеральнага пракурора з просьбай даць прававую ацэнку праекту будаўніцтва атамнай электрастанцыі — наколькі ён адпавядае беларускаму заканадаўству.**

Трывогу ў сувязі з атамнымі перспектывамі Беларусі падагрэла нядаўняя сустрэча ў Сочы прэзідэнтаў Беларусі і Расіі, калі былі пацверджаныя намеры распачаць будаўніцтва АЭС у Астравухы на Гродзеншчыне ўжо сёлета. Пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў раней таксама агучваў інфармацыю аб тым, што ўжо ў верасні Расія пераявдзе першы транш грошай, і будаўніцтву будзе дадзены старт.

«У адпаведнасці з артыкулам 18 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, дзяржава прызнаная бяз'ядзернай. Рашэнне аб будаўніцтве было прынятае вузкім колам асобаў, а дакладней, Саветам бяспекі яшчэ ў 2008 годзе, — зазначае каардынатар ініцыятывы «Астравецкая атамная — гэта злачынства» Мікола Уласевіч. — Затым былі рашэнні другіх органаў аб будаўніцтве. Па сутнасці гэта келейнае рашэнне, яно не абмяркоўвалася шырока з удзелам грамадскасці. Тое слуханне, што было ў кастрычніку 2009 года ў Астраўцы, гэта здзек — казарменныя ўмовы, спецпропускі, АМАП, кардоны. Я выпадкова праравўся, але мне не далі гаварыць, перарвалі». Жыхары Астравеччыны настойліва нагадваюць, што гэты край — запаведны, і будаваць там трэба не атамную станцыю, а санаторыі і дамы адпачынку.

Ураджэнец Астравеччыны, дзіцячы лекар Алег Віткоўскі ўжо шмат гадоў жыве і працуе ў Германіі. У якасці прыкладу для параўнання адносінаў да атаму Віткоўскі прыводзіць пазіцыю нямецкіх уладаў: «Гэта шматслойная праблема, як цыбуліна. Кожны слой будзеш здымаць і плакаць. У сакавіку Фукусіма — нямецкі ўрад імгненна рэагуе, сем атамных электрастанцый зачыненыя. Астатнія дзевятнаццаць, паводле закона, будуць зачыненыя да 2021 года. Сямнаццаць камерцыйных станцый працуюць і адзінаццаць як фізічныя лабараторыі, для вывучэння сучасных метадаў пагашэння, бо гэты працэс некіруемы. Проста так станцыю немагчыма выключыць. Яшчэ адзін цікавы факт: каб пабудаваць такую станцыю, немцам патрэбна сямнаццаць гадоў, а ў Беларусі гэта хочуць зрабіць за пяць».

Алег Віткоўскі расказаў, што калі даследаваць геаграфію размяшчэння АЭС у Германіі і распаўсюджванне захворванняў крыві, анкалогіі, то гэтыя карты супадаюць. «Фізіка — гэта тое вымярэнне, ад якога мы схаваны сваімі органамі пачуццяў. Можна ўзяць дазіметр, падысці да сцяны станцыі, памераць і пабачыць, што яна нічога не выпраменьвае. Гэта абсалютна бяспечна — так гавораць прыхільнікі сучасных спосабаў здабычы энергіі. Гэта ж хочуць прадаць і беларусам. А ёсць і эмпірычны спосаб. Вось мы пражылі трыццаць гадоў на гэтых тэрыторыях і раптам выявілася, што тут больш паміраюць, больш хварэюць. І хварэюць на такія захворванні, з якімі мы на сённяшні дзень не можам спраўляцца», — дзеліцца сваімі назіраннямі медык.

КОШТЫ

# ПІЦЬ І ПАЛІЦЬ ЦЯПЕР ДОРАГА

**У Беларусі з 1 верасня па 31 снежня 2011 года істотна падвышаюцца стаўкі акцызаў на алкагольную і тытунёвую прадукцыю. Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ва ўказе прэзідэнта ад 30 жніўня 2011 года № 378.**

Стаўка акцыза на моцныя алкагольныя напоі з 1 верасня складзе 30 тысяч беларускіх рублёў (5,9 долара па курсе Нацбанка краіны) за 1 літр бязводнага спірту ў гатовай прадукцыі і павялічана на гарэлку і вінныя напоі з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 28% — на 35,4%, на лікёрагарэлачныя вырабы з аб'ёмнай доляй спірту ад 7% да 28% — на 79%, на каньяк, брэндзі, кальвадос і каньячныя напоі — на 60,6%, на арыгінальныя алкагольныя напоі з аб'ёмнай доляй этылавага спірту 28% і больш, што выпрабляюцца па нетрадыцыйнай тэхналогіі з прымяненнем народных рэцэптаў у культурна-этнаграфічных цэнтрах, нацыянальных парках і запаведніках у мэтах аднаўлення паўнаты беларускіх традыцый, — у 2,7 разы.

Стаўка на арыгінальныя вінаградныя віны павялічана на 0,7%, да 28 тысяч беларускіх рублёў за 1 літр бязводнага этылавага спірту ў гатовай прадукцыі, на пладовыя мацаваныя ардынарныя і вінаградныя віна (за выключэннем арыгінальных, натуральных, у тым ліку пенных, шампанскіх, газіраваных і ігрыстых) — у 2,7 разы, да 16 тысяч беларускіх рублёў.

У дачыненні да напояў слабаалкагольных з аб'ёмнай доляй этылавага спірту ад 1,2% да 7% з 1 верасня 2011 года будуць прымяняцца акцызы ў памеры 55 тысяч беларускіх рублёў, слабаалкагольных натуральных напояў — 18,2 тысячы беларускіх рублёў. Да гэтага дзейнічала стаўка акцызу на ўсе слабаалкагольныя напоі з аб'ёмнай доляй да 7% у памеры 35 тысяч беларускіх рублёў.

З 1 верасня стаўка акцызу на піва з утрыманнем спірту 0,5% — 7% павялічана ў 2,9 разы ў параўнанні са старой стаўкай да 1 тысячы беларускіх рублёў за 1 літр гатовай прадукцыі, з утрыманнем спірту больш за 7% — у 3 разы, да 2 тысяч беларускіх рублёў.

Падакцызная тытунёвая прадукцыя ў верасні-снежні 2011 года будзе абкладацца наступнымі стаўкамі: тытунь для люлек (за 1 кг) — 85 тысяч беларускіх рублёў; курыльны тытунь (за 1 кг) — 85 тысяч беларускіх рублёў, цыгары (за 1 шт) — 3,6 тысяч беларускіх рублёў, цыгарылы (за 1 тыс. шт) 30,5 тысячы беларускіх рублёў.

На цыгарэты з фільтрам (за 1 тысячу штук) пры кошце да 150 тысяч беларускіх рублёў будзе дзейнічаць стаўка акцызу ў памеры 15,31 тысячы беларускіх рублёў, па кошце ад 150 да 300 тысяч беларускіх рублёў — 40 тысяч беларускіх рублёў, пры кошце ад 300 тысяч беларускіх рублёў, а таксама на цыгарэты з фільтрам, рознічны кошт на якія не ўстаноўлены, — 60 тысяч беларускіх рублёў.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ПРЫЦІСНУЛА?

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Здаецца, беларускага правадыра прыціснула эканамічная сітуацыя ў Беларусі. Прыціснула настолькі, што ён вымушаны прымаць не толькі эканамічныя, але і палітычныя захады для стабілізацыі сітуацыі.**



Рыначны курс беларускага рубля будзе вызначаны ў сярэдзіне верасня на дадатковай сесіі таргоў на Беларускай валютна-фондавай біржы, заявіў Аляксандр Лукашэнка 30 чэрвеня на нарадзе па пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця. «Усім, хто жадае купіць валюту, — ад чаго аж стогне наша насельніцтва, асабліва ў Мінску, — такая магчымасць будзе дадзеная», — заявіў Лукашэнка.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, ён згадзіўся з прапановай Нацыянальнага банка аб адкрыцці з сярэдзіны верасня дадатковай сесіі таргоў на валютнай біржы, на якой можна будзе свабодна купіць і прадаць долары, еўра, расійскія рублі і іншую валюту. Увесь валютны попыт і прапановы будуць сканцэнтраваныя на валютнай біржы», — сказаў Лукашэнка.

Ён даручыў ураду і Нацбанку «самым жорсткім чынам» узяць пад кантроль работу валютна-фондавай біржы.

На асноўнай сесіі валюта будзе прадавацца толькі для аплаты за пастаўлены прыродны газ, электраэнергію і іншыя неадкладныя плацяжы, з тым, каб гэта было стрымліваючым фактарам росту цэн.

«Усе абменныя пункты банкаў пасля адкрыцця дадатковай сесіі абавязаныя праводзіць свабодны продаж валюты па рыначным курсе», — падкрэсліў Лукашэнка.

Ён таксама заявіў, што ўлады не маюць намеру штучна падтрымліваць курс нацыянальнай валюты. «Курс беларускага рубля будзе вызначацца попытам і прапановай, як любы тавар», — запэўніў кіраўнік дзяржавы. У той жа час, адзначыў ён, камітэт Дзяржкантролю і праваахоўныя органы павінны паставіць жорсткую заслону спекулянтам, якія цяпер «штучна нагнятаюць абстаноўку». «Гэта тычыцца і сродкаў масавай інфармацыі, за гэта адказвае Адміністрацыя прэзідэнта», — падкрэсліў Лукашэнка. Нацбанк павінен штодня адсочваць сітуацыю, пры неабходнасці ўмешвацца, збіваючы спекулятыўныя напады.

Каб гэта было штучна, не трэба было б прымаць і больш радыкальныя захады. Прыкладам, Аляксандр Лукашэнка заклікае бізнэс і насельніцтва «падставіць плячо дзяржаве».

«Бізнэс, прадпрыемствы і фізічныя асобы, якія паспяхова працуюць, павінны разумець, што цяпер дзяржаве трэба падставіць плячо. Мы маем беспрэцэдэнтны рост цэн», — заявіў ён.

Ён таксама заявіў, што як мінімум да канца года адмяняе «дзеянне ўсякіх указаў і нарматыўных актаў па забароне КДК і праваахоўным органам праводзіць кантрольныя праверкі там, дзе палічаць патрэбным кіраўнікі гэтых кантрольных органаў, з мэтай стабілізацыі фінансавага становішча».

Так што бізнэс чакае чарговае «раскулачванне». А што чакае насельніцтва? Не пазней за кастрычнік валюту пачнуць прадаваць толькі па пашпарце. Гэтая электронная сістэма будзе збіраць інфармацыю пра кожнага беларуса — пакупніка валюты.

Больш за тое, у Беларусі 1 верасня будуць павышаны тарыфы на некаторыя паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Гэта прадугледжана пастановай Савета міністраў №1153 ад 30 чэрвеня, тэкст якой размешчаны на сайце Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі.

Згодна з дакументам, тарыф на паслугі па тэхнічным абслугоўванні жылых дамоў павялічыцца ў параўнанні з ранейшым на 10% — з 309 да 340 рублёў у месяц за 1 квадратны метр агульнай плошчы жылога памяшкання.

**Бізнэс чакае чарговае «раскулачванне». А што чакае насельніцтва? Не пазней за кастрычнік валюту пачнуць прадаваць толькі па пашпарце. Электронная сістэма будзе збіраць інфармацыю пра кожнага пакупніка валюты**

Тарыф на халоднае водазабеспячэнне вырасце на 25,1% — з 467,5 да 585 рублёў за 1 кубаметр.

Акрамя гэтага, на 26% павялічваецца тарыф на каналізацыю — з 242 да 305 рублёў за 1 кубаметр.

Тарыф за карыстанне ліфтам будзе павялічаны на 19,6% — з 1421 да 1700 рублёў з аднаго жыхара ў месяц.

29 жніўня Аляксандр Лукашэнка на нарадзе педагагічнага актыву ў Мінску прапанаваў «усім людзям цвярозага розуму, якія любяць сваю краіну, да якога б палітычнага лагера яны ні належалі, сесці за круглы стол, паглядзець адзін аднаму ў вочы і рэальна ацаніць, хто чаго варты і што можна зрабіць для эфектыўнага паляпшэння сітуацыі ў краіне». «Хочаце змагацца — калі ласка: змагайцеся ў адкрытай дыскусіі, даказвайце, што маеце рацыю, адстойвайце свой пункт гледжання», — дадаў Лукашэнка.

Ах, колькі ўжо было гэтых перамоваў! І рада пры АБСЕ, дзе тады старшыняваў Ханс-Георг Вік, і Кансультацыйны савет пры Адміністрацыі прэзідэнта! І ўсё безвынікова. Таму зусім не дзіва, што апазіцыя пайшла «на прынцып». Без вызвалення палітзняволеных перамовы з уладай немагчымыя — такое адзінае меркаванне лідараў апазіцыйных партый і рухаў, якія абмеркавалі на сустрэчы 30 жніўня ў Мінску фармат магчымага дыялогу з уладамі. «Усе пагадзіліся з тым, што фармат любога дыялогу немагчымы без вызвалення палітзняволеных», — паведаміў БелаПАН адзін з удзельнікаў сустрэчы, сустаршыня аргкамітэта па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» і былы кандыдат у прэзідэнты Віталь Рымашэўскі.

У сустрэчы ўзялі ўдзел прадстаўнікі АГП, Партыі БНФ, Беларускай партыі левых «Справядлівы свет», руху «За Свабоду» і «Гавары праўду!», аргкамітэта па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя», каб абмеркаваць магчымасці дыялогу з уладамі.

У сваю чаргу, старшыня АГП Анатоль Лябедзька дадаў, што апазіцыя гатова да перамоў з уладай на аснове «жорсткага парадку дня і фіксавання па часе выканання дасягнутых дамоўленасцяў». Першачарговае патрабаванне, без якога такія перамовы немагчымыя, вызваленне палітзняволеных. Сярод пытанняў, якія ў ліку асноўных павінны быць вынесены на абмеркаванне, лідары апазіцыі назвалі выбарчае заканадаўства і выхад Беларусі з крызісу.

А тым часам, неяк незаўважна прайшла ў Беларусі вельмі важная дата — святкаванне 20-х угодкаў таго, як 25 жніўня Дэкларацыі аб незалежнасці Беларусі быў нададзены статус канстытуцыйнага закона. У той час, як у суседняй Украіне гэтае свята вельмі шырока адзначалася як дзяржаўнымі, так і недзяржаўнымі арганізацыямі. Узгадвалі пра свята толькі палітычныя партыі і недзяржаўныя арганізацыі. БНФ з гэтай нагоды зладзіў прэзентацыю новага офіса, Таварыства беларускай мовы — сустрэчы з дэпутатамі Вярхоўнага савета, якія спрычыніліся да прыняцця Дэкларацыі аб незалежнасці, КХП — БНФ правяла з'езд. А дзяржава ад святкавання сваёй жа дзяржаўнасці неяк ухілілася.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### НАДЗЕЯ АСТАПЧУК




Экс-чэмпіёнка свету па штурханні ядра, беларуская лёгкаатлетка Надзея Астапчук у паўднёвакарэйскім Тэгу заваявала срэбра чэмпіянату свету па лёгкай атлетыцы ў штурханні ядра. Надзея паказала вынік 20,05 метра. Наша суайчынніца саступіла толькі новазеландскай спартсменцы Валеры Адамс, якая паслала снарад на 21,24 метра. Бронзавы медаль заваявала прадстаўніца ЗША Джыліян Камара-Уільямс — 20,02 метра. Яшчэ адна беларуска Наталля Міхневіч заняла 11-е месца з вынікам 18,47 метра.

Надзея Астапчук заваёўвае медалі на чацвёртым чэмпіянаце свету з пяці апошніх. На чэмпіянаце свету 2003 года ў Парыжы яна была другой, на чэмпіянаце свету–2005 у Хельсінкі стала чэмпіёнкай, на ЧС–2007 у Асацы — зноў заваявала срэбра.

Сёлета ж беларуская штурхальніца ядра Надзея Астапчук выйграла 4-ы этап Брыльянтавай лігі па лёгкай атлетыцы, што праходзіў у чэрвені. Яна штурхнула снарад на 20,59 метра — прадэманстравала лепшы вынік сезона ў свеце і ўсталявала рэкорд турніру.

### ІРЫНА ХАНУНІК-РАМБАЛЬСКАЯ



У Сафіі адбыўся фінал конкурсу прыгажосці «Місіс Сусвет». Нашу краіну там паспяхова прадставіла шыкоўная бландзінка Ірына Ханунік-Рамбальская. У Беларусь Ірына вярнулася з тытулам «Супермадэль».

«Нягледзячы на тое, што прапанова паехаць на конкурс ад нацыянальнага дырэктара сусветнай лігі прыгажосці і моды Віталя Жылінская паступіла вельмі нечакана і часу на падрыхтоўку амаль не заставалася, усё прайшло выдатна, — падзялілася сваімі ўражаннямі прызёрка конкурсу «Місіс Сусвет». — Сярод удзельніц былі жонкі алігархаў, якія змяняюць уборы коштам у некалькі тысяч долараў некалькі разоў у дзень. У мяне ж усё было больш сціпла, а на выніку гэта ніяк не адбілася. Як выявілася, арганізатараў конкурсу складана здзівіць дарагімі ўборамі. Значна больш яны цэняць прастату і шчырасць у зносінах, у чым неаднаразова прызнаваліся мне і рабілі кампліменты з гэтай нагоды. Я першапачаткова прыняла для сябе такую пазіцыю: не трэба гуляць чужую ролю, трэба быць сабой. І мела рацыю. Парадокс, але больш за ўсё пахвальных водгукаў я атрымала ад дэлегацыі з Венесуэлы. У іх дзяўчыны з падобнымі вонкавымі дадзенымі — вялікая рэдкасць. Хоць, мабыць, бландзінкі становяцца рэдкасцю не толькі ў Лацінскай Амерыцы, але і ва ўсім свеце, — з 26 удзельніц было толькі пяць бялявых. Венесуэльцы запрашалі мяне прыняць удзел у іх конкурсе прыгажосці і абяцалі безумоўны поспех!

### НАДЗЕЯ ЕРМАКОВА



Старшыня Нацыянальнага банка Беларусі Надзея Ермакова запэўнівае, што рэсурсаў для выканання задачы па выхаду на адзіны курс беларускага рубля хапае. «Ёсць дастаткова сродкаў для таго, каб гэтыя задачы можна было выканаць», — адзначыла яна падчас нарады ў кіраўніка дзяржавы. Да слова, не так даўно яшчэ на пасадзе старшыні буйнейшага ў краіне АСБ «Беларусбанка» спадарыня Ермакова абурана пыталася: «Ну навошта вам гэты долар?!» І са спакоем стоіка прыводзіла ў якасці прыкладу сябе: «Ну, зносім не двое туфель, а адны».

Адказваючы на пытанне пра тое, на якім узроўні можа ўраўнаважыць курс беларускага рубля ў адносінах да долара ЗША, кіраўнік Нацбанка сказала: «Гэта пакажа рынак». Паводле слоў Надзеі Ермаковай, на дадатковую сесію таргоў на валютнай біржы ў сярэдзіне верасня, па выніках якой будзе вызначацца рынкавы курс беларускага рубля, будуць дапушчаныя ўсе без абмежаванняў, хто хоча купіць або прадаць валюту. Кіраўнік Нацбанка таксама адзначыла, што для спынення магчымых спекулятыўных нападаў будуць выкарыстоўвацца розныя рынкавыя метады. Новапрызначанаму кіраўніку Нацбанка, відаць, варта рыхтавацца да складанага працоўнага перыяду.

Падчас гэтай жа нарады па сацыяльна-эканамічных пытаннях кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў навесці парадак у банкаўскай сістэме і заклікаў банкі дапамагчы ўраду і Нацбанку стабілізаваць сітуацыю ў краіне.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ЗАБЫТЫ ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ

Сяргей НІКАЛЮК

**Паміж адсутнасцю стабілізацыі на валютным рынку і расколам грамадства на першы погляд няма непасрэднай сувязі, але толькі на першы погляд.**



2011 год — год круглых датаў. 24 жніўня дваццаціоддзе сваёй незалежнасці адзначыла Украіна, а 25 жніўня — Беларусь. Рэспубліка-партызанка зрабіла гэта своеасабліва. Адкрываю сайт «адзінага палітыка» (АП). У раздзеле «Навіны» знаходжу віншаванне «ад імя беларускага народа і сябе асабіста прэзідэнта Украіны Віктара Януковіча з нацыянальным святам — Днём Незалежнасці». Віншаванне датавана 24-м жніўня. Двума днямі раней змешчана інфармацыя пра віншаванне з днём нараджэння кіраўніка Адміністрацыі Валгаградскай вобласці. 21 жніўня АП павіншаваў Каталікоса ўсіх армян з нагоды 60-летняга юбілею.

Я некалькі разоў уважліва прагледзеў галоўную старонку галоўнага афіцыйнага сайта краіны, і не знайшоў віншавання, адрасаванага мне асабіста, маім дзецям, унукам, а таксама астатнім грамадзянам Беларусі. Я адкрыў сайт «самай салiднай газеты». Вынік быў аналагічны. У дзень дваццацігоддзя незалежнасці ў якасці топ-навіны рэдакцыя вылучыла інфармацыю пра землятрус у ЗША.

## Трохразовае «Ура!»

У англійскага пісьменніка Дональда Бісета ёсць выдатная казка пра забыты дзень нараджэння. У свой час я любіў чытаць яе сваім дзецям. І сёння не магу ўтрымацца, каб не працытаваць фрагменты гэтага маленькага шэдэўра:

«Раптам ён (сланянё) пачуў, што хтосьці плача. Плакалі зусім побач, хоць Ялмар не бачыў хто. І ён сказаў:

— Не плач. Хочаш, я дапамагу табе?

Плакаць перасталі.

— Хто ты? — спытаў Ялмар.

— Забыты дзень нараджэння. Я не ведаю, чый я.

— Ай! — сказаў Ялмар. — Вось бяда. А святочны пірог у цябе ёсць?

— Які ж гэта дзень нараджэння без пірага! На маім вось шэсць свечак, значыць, камусьці сёння споўнілася шэсць гадоў».

На святочным пірагу беларускай дзяржаўнасці 20 свечак, але дзяржаве ён не патрэбны. Задзьмуць свечкі няма каму. Дзяржава не тое каб забылася пра свой дзень нараджэння, яна ад яго адмовілася. Таму разлічваць на шчаслівы канец, як у Бісета, шанцаў у нас няма. Мяркуйце самі:

«— Успомніў! — сказаў тата-слон. — Я так і ведаў, што гэта ўчора, ці заўтра, ці сёння. Так і ведаў!

— Што сёння? — спытаў Ялмар.

— Што сёння твой дзень нараджэння! — сказала сланіха-мама, уваходзячы ў пакой. — Табе сёння споўнілася шэсць гадоў».

Ялмар расхваляваўся і хутчэй пабег назад да невысокага ўзгорка побач з бамбукавым гаем.

— Паслухай! — крыкнуў ён. — Атрымлівацца, ты МОЙ дзень нараджэння. Мне сёння шэсць гадоў!

— Ура! — закрычаў забыты дзень нараджэння. — Ура, ура, ура!»

## Паміж рынкам і кірмашом

Паводле афіцыйнай версіі, *«Беларусь состоялась как самостоятельное и независимое государство»*. Гэтай падзеі папярэднічалі дзве катастрофы: *«Сначала величайшая техногенная катастрофа — Чернобыль, затем геополитическая — развал Советского Союза»*. Пакінем першую за дужкамі і засяродзім сваю ўвагу на другой. «Аналіз такіх ацэнак, — лічыць палітолаг Эміль Паін, — непазбежна спараджае пытанне: якім чынам можа скласціся адзіная і пазітыўная ідэнтычнасць у якароў дзяржавы, якая ўспрымаецца ўладамі і грамадствам як нечаканае і незаконнанароджанае дзіця, калека, ахвяра катастрофы і змовы?»

Распад шматнацыянальных дзяржаў — хваравіты працэс, які суправаджаецца крызісам ідэнтычнасці. Не так проста замест ранейшага «мы» сфармаваць новае, сфармаваць «пэўнае ядро салідарнасці грамадзян» (Аляксандр Філіпаў, філосаф), без якога немагчыма сучасная дзяржава-нацыя. Тут свае слова павінны сказаць эліты, у тым ліку палітычныя.

Фармаваць беларускую нацыю даводзіцца ва ўмовах расколатага грамадства. Праблема, аднак, пагаршаецца тым, што сам факт расколу на афіцыйным узроўні не прызнаецца. Кароткае прасвятленне, якое наступіла пасля Плошчы, хутка прайшло, і ўсе тыя, хто не ўпісваецца ў міфалагему адзінага народа, зноў ператварыліся ў прадстаўнікоў «пятай калоны». Пра гэта нам нагадаў АП 25 жніўня падчас нарады па актуальных пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Інтэграцыя сучасных грамадстваў забяспечваецца найперш культурным кансенсусам і ў меншай ступені — дзяржавай. Але ва ўмовах расколу для пераадолення сіл адштурхвання паміж часткамі грамадства, што супрацьстаяць адна адной, патрэбны пасярэднік — медыятар. Ролю медыятара і павінна браць на сябе дзяржава.

Вернемся да нарады, на якой было заяўлена пра неабходнасць *«выходить на нормальный уровень функционирования валютного рынка»*, і не проста выходзіць, а абапірацца на рашэнні, заснаваныя *«на объективных экономических законах, независимо от того, хотим мы того или нет»*. Ключавое слова ў працытаваным фрагменце — «рынак». Калі яго не зводзіць да паняцця «кірмаш», то пад рынкам варта разумець адну з формаў супольнасці, якая спалучае жыццё людзей у адзінае цэлае. Менавіта рынак ператварае «чужых» у «сваіх», бо ствараe сувязі як паміж вытворцамі (вытворчая аперацыя), так і паміж вытворцамі і спажыўцамі. Рынак, калі хочаце, — фактар развіцця абстрактнага мыслення, у адрозненне ад кірмашу, дзе прынята гандляваць, абапіраючыся на эмоцыі.

Ці здольная беларуская ўлада забяспечыць на справе *«нормальный уровень функционирования валютного рынка»*? Тут ёсць пытанні. Рынак не ў стане эфектыўна працаваць на падставе кропкавых рашэнняў. Рынак — гэта рынкавыя інстытуты, рынак — гэта лад жыцця мільёнаў, важны элемент масавай культуры, нарэшце. Яго разавымі рашэннямі не запусціць. Пры гэтым калі, праспаўшы 17 гадоў, раптам пачаць махаць шашкай, то лёгка можна выклікаць алергію ў большасці, якая прызвычаілася да дзяржаўнага патэрналізму, а калі і да рынку, то адміністрацыйнага, на якім усе пытанні вырашаюцца праз асабістыя сувязі.




## Яшчэ разумее, але ўжо не гаворыць

У штаце Пенсільванія ўкраінская дыяспара адзначала сваё нацыянальнае свята ў нядзелю, 21 жніўня. З гэтай нагоды мясцовыя фальклорныя ансамблі зладзілі традыцыйны канцэрт у мястэчку Хоршэм. Улічваючы, што мая малодшая дачка да нараджэння дзіцяці танчыла ў адным з такіх ансамбляў («Валошкі»), мы збіраліся наведаць свята ўсёй сям'ёй. Паездку, аднак, давялося адмяніць з-за дажджу. Выступаюць артысты на адкрытай сцэне, і ехаць з малечай мы не адважыліся.

Сярод удзельнікаў ансамбля мая дачка была адзіным эмігрантам у першым пакаленні. Усе астатнія нарадзіліся ў Амерыцы. Па-руску ніхто з іх не размаўляе, але ўсе гавораць па-ўкраінску. Гэты факт прымусіў мяне ўспомніць выпадак двухгадовай даўнасці. У 100-м аўтобусе, які курсуе па галоўным праспекце Мінска, ехалі маладая жанчына з дзіцем і яе бацькі. Яны пра штосьці перагаворваліся паміж сабой. Перыядычна жанчына спрабавала супакоіць занадта гарэзлівае малое. І тут я заўважыў, што на яе рэплікі дзіця адказвае па-англійску. Падобныя двухмоўныя дыялогі, толькі паміж бабулямі і ўнукамі, мне даводзілася назіраць у канцы 90-х у Брукліне.

А зараз разгледзім дадзены выпадак праз прызму «Азбукі паліталогіі». Маладая жанчына, відавочна, прыехала да бацькоў з англамоўнай краіны. Яе дзіця ў свае 3–4 гады па-руску яшчэ разумела, але ўжо не размаўляла. Праз некалькі гадоў яно пойдзе ў школу, значна больш часу будзе праводзіць па-за домам і, хутчэй за ўсё, рускую мову так і не асвоіць. У мяне няма інфармацыі адносна беларусаў, але адносна рускіх — гэта добра вывучаны факт: рускія эмігранты ў другім пакаленні, як правіла, цалкам губляюць сувязь з культурай сваіх бацькоў.

У гэтага парадоксу (а на фоне іншых нацыянальных дыяспар дадзены факт інакш як парадокс расцэньваць нельга) ёсць тлумачэнне. Асноўны кампанент нацыянальнай ідэнтычнасці рускіх — дзяржава. Апынуўшыся па-за зонай яе ўплыву, сталыя людзі, безумоўна, да канца сваіх дзён адчуваюць сябе рускімі, але ў культурным плане перадаваць дзецям ім няма чаго. Імігранты-дваране, якія ўцякалі ў гады рэвалюцыі, у гэтым сэнсе з'яўляюцца выключэннем.

Што аб'ядноўвае беларускую большасць? Не сакрэт, што галоўным інтэгратарам для прыхільнікаў «моцнай дзяржавы» з'яўляецца сама дзяржава, дакладней, яе здольнасць выступаць гарантам сацыяльнай справядлівасці. На мяжы 2002–2003 гадоў, калі гарант даў збой, сацыёлагі НІСЭПД зафіксавалі імклівы рост колькасці ахвочых інтэгравацца як з Расіяй, так і з Еўрасаюзам. Усё лагічна: страціўшы дзяржаўны «дах», прадстаўнікі большасці сталі падшукваць ёй замену.

## Улік і кантроль аб'ектыўных законаў

Што да меншасці, то яна не ўспрымае беларускую дзяржаву ў яе цяперашнім выглядзе як сваю, але пры гэтым (чарговы парадокс) менавіта прадстаўнікі меншасці складаюць касцяк апанентаў любых формаў інтэграцыі з Расіяй, што пагражаюць, на іх думку, дзяржаўнай незалежнасці Беларусі. Прычым такімі яны былі задоўга да пачатку беларуска-расійскіх інфармацыйных і іншых войнаў.

Мне ўжо неаднаразова даводзілася падкрэсліваць, што сучасныя нацыі — гэта цывільныя нацыі. Яны фармуюцца з дапамогай механізмаў уключэння насельніцтва ў кіраванне дзяржавай. Працытую яшчэ раз Карла Дэйча: «Нацыя — гэта грамадства, якое авалодала дзяржавай». Менавіта ў грамадзянах найперш мае патрэбу сёння палітычная эліта Беларусі, якая імкнецца абараніць свае меркантыльныя інтарэсы ад усходніх канкурэнтаў. Але адначасова менавіта ад грамадзян зыходзіць асноўная пагроза іх меркантыльным інтарэсам у самой краіне.

Аўтарытарызм з яго цэнтралізацыяй можа быць эфектыўны пры кіраванні толькі дастаткова простымі сацыяльнымі сістэмамі. Узровень складанасці беларускага грамадства ўжо даўно перарос кіраўнічыя магчымасці «вертыкалі». 25 жніўня нам паабяцалі звесці ўсё *«в один документ»*, і на наступным тыдні абвясціць, *«как будет действовать правительство и Нацбанк в этой ситуации»*. Да, ледзь не забыў: *«Будут определены ответственные и контролеры»*.

Дзяржава ў чарговы раз прадэманстравала сваю няздольнасць адэкватна ацэньваць выклікі, з якімі сутыкаецца расколатае грамадства. Яно па-ранейшаму робіць стаўку на кантралёраў, спадзеючыся з іх дапамогай наладзіць масавае прыняцце рашэнняў, заснаваных *«на объективных экономических законах»*. Грамадству, на думку дзяржавы, адводзіцца права толькі назіраць і верыць, што *«все у нас будет хорошо!»*

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# КАНЕЦ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ МЯСАРУБКІ

Працяг. Пачатак на стар. 1.

## Крызіс плацежнага балансу

З гэтых прычын у 2011 годзе сальда рэзка павялічылася ў параўнанні з мінулым годам — як ад росту аб'ёму нерэнтабельнай вытворчасці, так і ад росту яе коштаў. Гэта выклікала інфляцыю і ціск на курс рубля, што паставіла ўрад перад выбарам — дэвальвацыя або адміністрацыйнае рэгуляванне курсаў.

Калі ў кагосьці ёсць жаданне запалохаць сусветныя рынкі капіталу, няма лепшай меры, чым множнасць курсу валют. На крэдыт з Лондану, якім некалі ганарылася кіраўніцтва Беларусі, цяпер можна забыцца, нават праз RBS. Беларусь страціла адразу два пункты свайго і так невялікага крэдытнага рэйтынгу. Горш — тыя кароткатэрміновыя крэдыты, што былі выдаткаваныя раней, зараз трэба вяртаць, а па тых крэдытах, што ўзяла дзяржава, трэба плаціць працэнты.

Такім чынам, фінансаванне сальда праз дзяржаўныя каналы зрабілася яўным закладнікам палітыкі Расіі. Той факт, што з міждзяржаўнага траншу было выдаткавана толькі 800 мільёнаў, паказвае, што Беларусь афіцыйна ўвайшла ў так званы крызіс плацежнага балансу. Адгэтуль пачынаецца зачараванае кола — паніка стварае новую паніку, унутры і за мяжой.

Вось сумнае меню захадаў, якія мусяць здзейсніць краіны ў стане плацежнага крызісу:

- Поўная дэвальвацыя нацыянальнай валюты, да чорнага курса. Звычайна гэта дапамагае збалансаваць гандаль, бо робіць экспарт таннейшым, а імпарт даражэйшым, але Беларусі гэта не надта дапаможа, бо значная часта яе імпарту і экспарту (энергія простая і ўскосная) дэнамінавана ў доларах. У Беларусі, дэвальвацыя б'е найперш па спажывецкіх таварах і прадуктах харчавання, што вельмі непапулярна. Таксама за дэвальвацыяй хутка ідуць інфляцыя і рэальная страта ўзроўню жыцця.
- Кантроль капіталу — забарона на вываз валюты, рэгуляванне яе набыцця. Гэта ўрад Беларусі, аматар адміністрацыйных мераў, робіць з найвялікім імпэтам, але тое мера часовая, і таксама вельмі непапулярная. Абмежаванне валютнага патоку за мяжу — таксама складаная задача, бо большасць валюты ідзе на закуп прамысловага імпарту, абмежаванне азначае зніжэнне вытворчасці.
- Адміністрацыйнае абмежаванне імпарту дзеля таго, каб стабілізаваць гандлёвае сальда. Таксама інтуітыўная мера для беларускай вертыкалі. Але абмежаванне спажывецкага імпарту не толькі непапулярна, але і не вельмі эфектыўна. Большасць беларускага імпарту — гэта энергія і камплектуючыя, скарачэнне іх зноў азначае скарачэнне вытворчасці.
- Простае скарачэнне неэфектыўнай вытворчасці. Такая палітыка змяншэння мясарубкі збалансуе і гандаль, і крэдыт, але таксама знізіць ВУП тэмпамі пачатку 90-х. На гэтую меру ўрад свядома не пойдзе.
- Скарачэнне рэальнага кошту вытворчасці — праз скасаванне сацыяльных выдаткаў, пенсій, заробкаў, або падвышэнне заробкаў менш за тэмп інфляцыі. Пасля таго, як уся передвыбарчая праграма была пабудавана на заробкавым хабары, гэта апошні крок беларускага рэжыму.

Усе гэтыя меры азначаюць толькі адно — зменшыць аб'ём працы ўсё той жа мадэлі мясарубкі. І вядуць яны да зніжэння занятасці, сацыяльных выдаткаў і ўзроўню жыцця ў Беларусі — да антытэзы гэтаму рэжыму. Вольна ці нявольна, урад Беларусі ўжо робіць гэтыя крокі, і яны маюць пэўны эфект. Напрыклад, экспарт Беларусі ў маі 2011 года дасягнуў рэкорднай у гісторыі Беларусі адзнакі, а імпарт узрос не нашмат, што дапамагло збалансаваць сальда. У чэрвені яно зноў было небяспечна адмоўным, але гэта быў месяц масавага набыцця аўтамашын. Магчыма, ліпеньскі баланс зноў будзе неблагім.

Але фанфары не гучаць, бо нават урад усведамляе, што, вырашаючы валютна-крэдытны крызіс, ён стварае крызіс эканамічны. Наступная стадыя — рэальнае скарачэнне ўзроўню жыцця — заробкаў, пенсій, лядовых палацаў, грамадскага транспарту, усіх тых атрыбутаў эканамічнага і палітычнага цуда, што дэманстравала амаль дваццаць гадоў Беларусь.

## Карта выйсця

Вядома, урад Беларусі марыць пра тое, каб проста адкруціць гадзіннік да сітуацыі 2006 года: вярнуць узровень нафтагазавых датацый, скасаваць неабходнасць пералічваць Расіі падаткі за экспарт бензіну, усталяваць неабмежаваны доступ да расійскага крэдыту.

Палітычна такая магчымасць у выбарны год у Расіі існуе. У расійскай сістэме каштоўнасцей, Беларусь, за якую маскоўская карона вяла барацьбу больш за 300 гадоў, важыць значна болей, чым колькі мільярдаў тон таннай нафты. Рацыянальнае пераасэнсаванне гэтай матэматыкі, што адбывалася цягам апошніх гадоў, можа адступіць, калі сапсуецца кан'юнктура расійскіх выбараў, ізноў адчыніўшы гандаль пацалункамі.

Праблема, аднак, у тым, што эканамічна-палітычны фундамент гэтага гандлю цалкам перабалансаваўся. На гэты момант для Расіі будзе прасцей увогуле зачыніць беларускую праблему і ўшанаваць памяць Івана III поўным вяртаннем Беларусі ў межы імперыі. Эканамічна гэта проста больш танна, чым безумоўнае фінансаванне Лукашэнкі. Бо нават у 2007 годзе, на піку прэферэнцый, гандлёвае сальда Беларусі было адмоўным.

З тых часоў беларуская вытворчасць стала яшчэ больш неэфектыўнай. Ёй патрэбныя інвестыцыі ў абсталяванне, тэхналогіі, новы сучасны менеджмент і масіўнае скарачэнне кошту вытворчасці. Беларускія канцэрны маюць добрыя выходныя рынкі, але, акрамя бензіну, над якім вісіць меч заходніх санкцый, яны знаходзяцца ў Расіі, а іх уваходная інфраструктура амаль цалкам залежыць ад яе. З капіталістычнага пункту погляду, інтэграцыя беларускіх прадпрыемстваў у расійскія холдынгі — найбольш просты і эфектыўны шлях.

Палітычны курс іміджу Расіі і Беларусі таксама цалкам змяніўся. Калі шмат гадоў беларусам Расія здавалася гэткай дзікай і непажаданай альтэрнатывай беларускаму цуду, зараз яна пачынае выглядаць як багатая з сучасным профілем краіна і, галоўнае, як гарант фінансавага паратунку.

Прыватызацыя беларускіх прадпрыемстваў у расійскія холдынгі прынесла б ад 10 да 20 мільярдаў долараў — у залежнасці ад памеру «палітычнай зніжкі» і ацэнкі «Беларуськалія». Гэта б гарантавала пяцігодку фінансавання гандлёвага балансу, стабілізавала валюту, бюджэт, спажывецкія рынкі і прывяло б да мадэрнізацыі вытворчасці — вядома, на тых прадпрыемствах, што захаваюцца.

Але адначасова мела б сваім вынікам поўную страту рэшткаў эканамічнага суверэнітэту Беларусі, а неўзабаве і палітычнага, бо ў расійскай сістэме паміж бізнесам і палітыкай няма «правіла працягнутай рукі».

На заходнім напрамку дапамога ад МВФ будзе патрабаваць рэформ накшталт шокавай тэрапіі, алергія да якой у свой час і прывяла да беларускай мадэлі. На гэта ўрад не пойдзе, але, вядома, будзе дынаміць МВФ і далей. Можа, і атрымае пэўны транш, але гэтым часам фонд будзе дамагацца рэформ або чакаць змены ўраду. Нават калі б МВФ і выдаў Беларусі 8 мільярдаў і не запатрабаваў аніякіх рэформаў, гэта ўсё роўна не выратуе беларускую мадэль, а толькі адцягне яе час. Без структурнага рэфармавання крызіс непазбежна наступіць зноў, і кожны новы яго раўнд будзе горшым за папярэдні.

Дваццаць страчаных гадоў — страчаныя ўдвая, бо марнаваўся не толькі час. Залаты дождж, што сыпаўся з Расіі ў кашэль беларускага рэжыму, быў выкарыстаны не для паступовага рэфармавання дзяржаўнай эканомікі і адкрыцця магчымасцяў і прыватнай ініцыятывы, а на рэанімацыю аджыўшай эканамічнай і палітычнай сістэмы. І вось нават той напаўнамінальны суверэнітэт Беларусі, здабыты дваццаць гадоў таму, зараз пастаўлены пад вялікую пагрозу.

Дваццаць гадоў — і перад намі выбар, які прыкладна тады ж трапна апісаў беларускі бард Віктар Шалкевіч: «І марнела надзея — ці пачаць усё спачатку, ці зрабіць наадварот».

КАЛОНКА КАНСТАНЦІНА СКУРАТОВІЧА

# ВЫСПА ПІНГВІНАЎ



**На нарадзе з педагогамі Лукашэнка быў шматслоўны. У выніку логіка яго выступлення аказалася настолькі шматзначнай, што можна казаць пра яе адсутнасць.**

Гаварыў пра тое, як урад і прэзідэнт раздавалі безаглядна грошы, пра тое, як яны ж справакавалі народ на ажыятажную закупку іншамарак. Што прывяло да валютнага дэфіцыту. Але ж Лукашэнка і ўрад раздавалі грошы не свае, а бюджэтныя, менавіта яны друкавалі пустыя паперкі. А людзі выдаткоўвалі на аўто ўласныя грошы, уласную валюту, якая належала ім, а не дзяржаве.

Лагічна было б за жудасны стан эканомікі ўзяць усю адказнасць на сябе, а не перакладаць яе на плечы тых, хто ніякага ўплыву на дзяржаўныя фінансы не мае.

Але ж не дзеля таго збіраюць настаўнікаў на прэзідэнцкую нараду, каб распавесці ім эканамічныя банальнасці. Хоць настаўнікаў і называюць лаўцамі душаў, але ў нашых умовах іх можна лічыць і наглядчыкамі. За тым, каб дзеці не адступілі ні на крок управа ці ўлева ад вызначанай з вяршынь вертыкальнай лініі. Акрамя таго, ім загадана прывіваць любоў да Радзімы, дзяржавы, Канстытуцыі ды іншага атрыбутыўнага інвентару так, каб гэта любоў мела сваім аб'ектам толькі і выключна адну фігуру саміведаецекаго.

Гэта настолькі відавочна, што не патрабуе доказу, і можа лічыцца аксіёмай узаемных стасункаў паміж ім і школай. Прынамсі, гаворачы пра высокае і патрыятычнае, педагогі і іх вучні павінны разумець, што маецца на ўвазе менавіта гэты мужны чалавек, якому ўсе вінны за ўсё.

Тады гэтак жа лагічна, што ўсіх астатніх можна рассартаваць па годнасці, вартасці, карыснасці, варожасці. Як казаў той, давайце ўяснім гэтую простую ісціну.

Быццам бы, сапраўды, для паспяховага, дынамічнага развіцця краіны патрэбны не рэвалюцыя і вулічная анархія, а з'яднанасць усіх грамадзян незалежна ад іх поглядаў, скіраванасць на канструктыўнае супрацоўніцтва. Але ж калісьці старшакласніцы пісалі сабе як заклінанне ў агульны сшытак-песеннік — памры, але не давай пацалунак без кахання. І сапраўды, некаторыя пamiралі, а некаторыя заставаліся нецалаванымі да скону жыцця.

А зараз што? Мноства, калі не большасць тых, да каго ўлада лезе з пацалункамі, мякка кажучы, яе не кахаюць. Наадварот, лічаць, што краіне вельмі не пашанцавала калісьці з начальствам, і таму яно/ён павінны сысці дзеля агульнай карысці. Каб не заядаць людзям веку, каб не марнаваць дарэмна час, як гэта яно робіць на працягу ўсяго тэрміна свайго бездапаможнага кіравання.

На пачатку 1990-х гадоў самымі актыўнымі прыхільнікамі перамен былі людзі пад 30–40 гадоў, якія сёння падышлі да пенсійнага ўзросту. Якіх, ужо відавочна па ўсім, за выключэннем асобных статыстычных выключэнняў, чакае гаротная старасць, жабрацкае дажыванне.

Ніколі Беларусь за ўсю сваю гісторыю не мела такіх цудоўных магчымасцей, каб наладзіць годнае жыццё для сваіх людзей. Увесь свет ставіўся і ставіцца з павагай і спачуваннем да яе народа. А рэжым усё шукае ворагаў. І знаходзіць. Зразумела, у першую чаргу сярод беларусаў, якім смяротна надакучылі бесперапынныя спробы брутальных абдымкаў. Але яшчэ болей за мяжой. Прычым ужо і ў Расіі, а не толькі ў Еўропе. Усе замінаюць. Быццам бы ў Беларусі ёсць нейкі скарб, які не дае спакою, не дае спаць ад зайздрасці.




І атрымліваецца дурная бясконцасць — усіх ворагаў не пералічыш. Лезуць, атакуюць, ціснуць з усіх бакоў, злева і справа. Каб не дазволіць дзяржаве ў цэнтры Еўропы хадзіць «у белых пальчатках», радавацца жыццю. Каб заваяваць, падарваць валюту, засыпаць дустам, заблакіраваць беларускія тавары, бо яны лепшай якасці і танныя. Насядаюць праз інтэрнэт, праз сацыяльныя сеткі, каб дзеці не чыталі не слухалі сваіх айчынных аракулаў, шматслоўных і незразумелых прамоў. Якія і настаўнікі слухаюць па абавязку, бо іх сабралі спецыяльна і сочаць, каб ніхто не заснуў ад адчаю зразумець ісціны «ў геастратэгічным плане».

Паспрабуй хто слова ўставіць, такі дыялог атрымаецца.

Пятая калона, ворагі, ворагі, ворагі… Проста бяда нейкая — каго б беларус дзе ні сустрэў, павінен чакаць, мінімум, аплявухі. Калі дома, то гэта, зноў жа, аксіёма. Тут прычын не шукаюць, толькі зачэпку. А калі не, то б'юць проста так, ад дрэннага настрою, таму што загадана. А вось у замежжы нічога такога асаблівага ў стаўленні да беларусаў не адзначаецца.

У гэтай сувязі ўспамінаецца «Выспа Пінгвінаў» Анатоля Франса. Там падслепаваты хрысціянскі місіянер, праплываючы на караблі міма льдзіны, перахрысціў калонію пінгвінаў. Добра, што аб сваім хрысціянстве тыя не здагадаліся.

А мы не можам згадаць сваіх сусветных ворагаў. Магчыма, аратар зноў пераблытаў сваё і чужое?

▸ **РАЗМОВА**

# СНЫ І ПАРАЗЫ АЛІМПІЙЦА

**Трохразовы алімпійскі чэмпіён Уладзімір Парфеновіч сходу і ўшчэнт разбурае міф, што спартоўцы толькі і могуць размаўляць пра свае дасягненні. Пра заклееную зялёную кнопку ў Доме ўрада, пра тое, як правільна трэніраваць дзяўчат і што рабіць, каб сны прадказвалі алімпійскія перамогі, слынны спартовец расказвае журналістцы Вользе Хвоін і чытачам «НЧ».**

***— Спорт быццам бы мусіць быць па-за палітыкай. А вы ўголас абвясцілі пра свае палітычныя погляды.***

— Хто вам сказаў, што спорт мусіць быць па-за палітыкай? Спартсмен таксама чалавек і мае сваё меркаванне. Проста ў Беларусі ўкаранілі меркаванне, што, калі чалавек у апазіцыі, дык увогуле страчаны для грамадства. Але ж у нармальных краінах апазіцыя абавязкова мусіць быць, у парламенце абавязкова ёсць прадстаўнікі апазіцыйных партый. Гэта гістарычна выпрацаваная сістэма.

***— Цяпер Лукашэнка прапануе апазіцыі дыялог...***

— Ды ну! Які можа быць дыялог, калі яго апаненты сядзяць у турмах? І ўвогуле, гэты чалавек здольны хіба што на маналог.

***— Адсочваеце, як ідуць справы ў беларускіх весляроў? І як бы ацанілі вынікі апошняга Чэмпіянату свету?***

— Заўжды адсочваю і перажываю. Самае кепскае, што беларуская каманда для байдаркі-чацвёркі не заваявала ліцэнзію на Лондан–2012. Так што здавальняючае выступленне. Канешне, парадавалі дзяўчаты, яны малайцы. Расійская каманда таксама недавыканала задачу. Так, мы выступілі лепш, чым летась. Маглі б тры залатыя медалі прывезці, а заваявалі ў алімпійскай праграме толькі срэбра і дзве бронзы. Думаю, гэта таксама недахоп і пралік. Але будзем рыхтавацца, выпраўляцца. Каб быць на галаву мацней і ўвогуле нікому не даваць ні ўздыхнуць, ні выдыхнуць. У кастрычніку, відаць, правядзем сумесныя зборы. Школа адна — савецкая. І яе я вызнаю. Думаю, што адрозненні паміж падыходамі да веславання ў Расіі і Беларусі я ўжо знівеляваў, гэта ж буду рабіць надалей. Найлепшай вяслярнай школай у свеце усё адно будзе савецкая.

***— У Беларусі моцныя спартоўкі-вяслярkі. Дзяўчат цяжка рыхтаваць, яны ўвогуле не баяцца ісці ў гэты сілавы від спорту?***

— Спартыўную кар'еру ў вяслярстве варта пачынаць у адзінаццаць-дванаццаць гадоў. Гэта не зарана, у спартыўную гімнастыку дзетак увогуле ў чатыры гадкі аддаюць. Дзяўчынкі ідуць у вяслярства, бо ім цікава. І не варта палохацца, што фігура сапсуецца. Косці ж спіны не растуць ушыркі. А як дзяўчына сыходзіць са спорту, то праз пару месяцаў увогуле не застаецца на знешнасці знакаў ад яе спартыўнай кар'еры. І трэніраваць дзяўчат не складана. Канешне, ёсць асаблівасці — дзяўчаты больш эмацыйныя, больш уразлівыя. Але звычайна і больш адказныя, працавітыя, калі хочуць дасягнуць выніку.

***— Былі чуткі, што вы з Валерыем Фраловым задумалі ствараць Беларускі саюз афіцэраў, на ўзор таго, што ствараў Юрый Захаранка.***

— Не, нічым падобным я не займаюся. Кожная арганізацыя такога кірунку мусіць мець палітычныя мэты. То бок, у класічным разуменні змагацца за ўладу. Калі яны не змагаюцца за ўладу, то чым увогуле займаюцца? Гэта як суполка аматараў піва. Бачыўся я з Валерыем Фраловым і тое ж гаварыў яму. Таму не лічу правільным увогуле ўдзельнічаць у падобных утварэннях.

***— А верыце, што ў нас многа афіцэраў з ідэальным увасабленнем паняткаў «гонар», «абавязак», «сумленне»?***

— Няма такіх. У гады Вялікай Айчыннай вайны палова была паліцаямі, а другая палова — партызанамі. Падчас вайны 1812 года гэты падзел быў яшчэ менш прывабным. Вось яна — характарыстыка нацыі. І таму беларускім палітыкам я таксама не веру. Няма ім даверу. Перад выбарамі мне пазванілі з прапановай падтрымаць Раманчука. Але як можна гуляць па правілах махляра? Гэта ж падман. Калі людзі пагаджаюцца ісці на выбары ў ролі казлоў адпушчэння...

***— І ў 2004 годзе вы галадалі, каб было зменена выбарчае заканадаўства і супраць антыканстытуцыйнага рэферэндуму. Пасля такога дэмаршу адразу патрапілі ў няміласць да ўладаў... А маглі быць дэпутатам парламенту...***

— Так, быў бы дэпутатам і да гэтага часу. Але ў мяне зялёная кнопка для галасавання была заклееная ў авальнай зале. То мне заставалася толькі чырвоная, таму давялося галасаваць заўжды супраць. Ды я і да гэтага быў у няміласці. І не шкадую ні аб чым. Я ні да каго не напрошваюся. Гвалтоўна не будзеш любы.

Сёння ні ў Расіі, ні ў Беларусі мне не падабаецца. Але я люблю сваю працу. Ёй аддаю ўсе свае сілы і веды. Працаваць паўсюль цяжка, але мы дабіваемся выніку. Сёлета сталі адной з мацнейшых камандсвету.

А ў Беларусі я нават дворнікам не ўладкуюся. У мяне было некалькі аркушаў з тэлефоннымі нумарамі сяброў, з іх у маім нататніку засталіся толькі восем. Вось такія сябры былі. Але я іх не асуджаю. Ва ўмовах дыктатуры, калі ты можаш застацца без працы, без кавалка хлеба...

***— У Расіі ёсць адпаведны закон, які гарантуе алімпійскім чэмпіёнам пажыццёвую дзяржаўную падтрымку. Вы — алімпійскі гонар Беларусі, апроч выключэння з Нацыянальнага алімпійскага камітэта, нешта атрымліваеце цяпер?***

— Такі закон ёсць не толькі ў Расіі, але і ў краінах Балтыі, ва Украіне, Казахстане, Арменіі. У Маленькай Літве алімпійскія чэмпіёны пажыццёва атрымліваюць штомесячныя выплаты ў памеры каля тысячы еўра. У Беларусі прэзідэнцкім указам заснавана дзяржаўная стыпендыя алімпійскім чэмпіёнам, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, — тры бюджэты пражытачнага мінімуму. І ўсё. Дык кіраўнік дзяржавы, тым больш ён жа і старшыня Нацыянальнага Алімпійскага камітэта, мусіў бы заснаваць адэкватную пажыццёвую стыпендыю для алімпійцаў-чэмпіёнаў, каб хоць павагу да сябе заслужыць. Так яму і перадайце.

***— У адным з інтэрв'ю вы расказалі, што сваю алімпійскую перамогу прыснілі, і таму ўпэўнена ішлі на спаборніцтвы...***

— Так. Недзе за дваццаць дзён усё прыснілася. Усё, як і было потым у рэальнасці. Мне часта сняцца прарочыя сны. Але для гэтага трэба пэўны псіхалагічны стан, пэмежны, я б сказаў. Я мушу гэтым «гарэць», жыць...

***— То можа і бліжэйшую будучыню Беларусі снілі?***

— Не (смяецца), пакуль там цемра.

***— Чым будзеце займацца цягам таго часу, што ў Беларусі?***

— Цяпер рыхтуюся да канферэнцыі ў Маскве, потым з'езджу ў госці да сына. Быццам і адпачынак зараз у мяне, але трымае адчуванне незавершанасці справы. Напярэдадзе Алімпіяда ў Лондане. Да Алімпіяды трэба рыхтавацца не за месяц-два, і нават не за год. Падрыхтоўка пачынаецца мінімум за восем гадоў, тады магчыма вырасціць спартсмена да адпаведнага ўзроўню. Паспяховасць у спорце часам залежыць ад цыклічнасці, часам ад выпадку. Але заўжды важна не толькі спартыўную вяршушку рыхтаваць, але не забывацца і аб самых нізах. Не дастаткова будаваць у буйных гарадах лядовыя палацы, паўсюль мусяць быць спартыўныя школы, гурткі, адкуль і прыходзіць у спорт «свежая кроў».

***— Вы рэгулярна наведваеце Беларусь, па гэтым візіце заўважылі нейкія змены ў людзях, настроях? Усё ж крызіс моцна б'е па кішэнях...***

— Не, ніякіх зменаў. Сядзяць усе памяркоўныя па дамах са сваёй чаркай і шкваркай.

***— Дык шкваркі ўжо няма...***

— Гэта вы так думаеце. У беларусаў не так хутка ўсё заканчваецца. Увогуле, цяпер самы час для дзеянняў. Але ці хоць адзін народны абраннік-дэпутат нешта робіць? Хоць нейкі законапраект будзе лабіраваць, каб абараніць правы згалелых пенсіянераў? Не! У часы майго дэпутацтва я казаў, што згодны несці сцяг. Але толькі тады, калі за мной будуць ісці людзі. І ніхто ж не выйшаў. То чаго ім цяпер наракаць?



Алімпійскі чэмпіён Уладзімір Парфеновіч

## Для даведкі:

Уладзімір Парфеновіч — заслужаны майстар спорту СССР, трохразовы алімпійскі чэмпіён, дзевяціразовы чэмпіён свету і Еўропы па веславанні на байдарках і каноэ, былы старшыня Беларускай асацыяцыі каноэ, былы член Нацыянальнага алімпійскага камітэта, дэпутат Палаты прадстаўнікоў другога склікання, член дэпутацкай групы «Рэспубліка» (2000–2004 гады). Дэпутацтва і дадало да беларускіх пасадаў Уладзіміра Парфеновіча прыстаўку «экс» ды завяло яго ў Расію на пасаду памочніка прэзідэнта федэрацыі па працы са зборнымі камандамі. Ужо некалькі гадоў алімпійскі чэмпіён «падымае» зборную Расійскай Федэрацыі па вяслярству да сусветнага ўзроўню. А ў Беларусі трапіў у няміласць. Пасля галадоўкі дэпутатаў у 2004 годзе Парфеновіча выключылі з Нацыянальнага алімпійскага камітэта з фармуліроўкай «не апраўдаў ускладзеныя на яго функцыі па кіраўніцтву і арганізацыі эфектыўнай дзейнасці рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Алімпійскі фонд», «сваімі дзеяннямі нанёс маральную шкоду алімпійскаму руху і прынцыпам алімпізму».



2003 год. Злева направа: Барыс Нямцоў, Сяргей Скрабец, Уладзімір Парфеновіч, Леанід Сініцын

7

# TV ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## 5 верасня, панядзелак

---

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** Дак. серыял «Гараджане-2011».
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.10** Серыял «Маршрут літасці» (Расія). Заключная серыя.
**11.00** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**12.10** Вострасюжэтны фільм «Чужыя душы» (Расія).
**13.45** Сінематэка.
**14.30** Здароўе.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Камедыйны баявік «Таксі-2» (Францыя).
**17.05** Камедыйны серыял «Заклад» (Расія). 1-я серыя.
**18.00** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата « (Беларусь).
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Арэна.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.40** Камандзіроўка.
**21.55** Трылер «Рызыкоўчы жыццём» (ЗША).
**23.50** Дзень спорту.
**00.00** Дак. цыкл «У пошуках ісціны».

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** Контуры.
**10.15** «Дэтэктывы».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсерыйны фільм.
**12.00** «Таварышы паліцыянты». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Каралева экрану». Серыял.
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Адчынены фармат».
**22.10** Шматсер. фільм «У лясах і на гарах».
**23.10** «Сведкі».
**00.10** «Таварышы паліцыянты». Шматсерыйны фільм.
**01.05** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Вялікі горад».
**13.10** «Далёкія сваякі».
**13.50** «Зорны рынг».
**14.45** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**14.55** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** «Я-вандроўца».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Шыза». Расія-Германія-Францыя-Казахстан, 2004г.
**22.20** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**10.05** Жансавет.
**10.40** Канцэрт Whitesnake. Live In The Still Of The Night.
**12.40** Навіны надвор'я.
**13.10** Трагікамедыя «Мастацтва жыць у Адэсе» (СССР).
**15.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**16.55** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**17.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**19.55** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Канцэрт Whitesnake. Live In The Still Of The Night.
**23.20** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**00.05** Авертайм.
**00.35** Рэальны свет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.30** «Ранішняя пошта».
**10.00** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**12.30** «Кулагін і партнёры».
**13.00** «Пакой смеху».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Прамы эфір».
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**21.30** Тэлесерыял «Галубка».
**23.20** Тэлесерыял «Асобы, якіх ахоўваюць».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** «Дзяжурны па краіне».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Праграма Максімум».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.05** Сёння.
**10.20** «Рускія сенсацыі».
**11.10** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.25** Дэтэктыўны серыял «Таўро».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Марскія д'яблы».
**21.20** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.30** «Сумленны панядзелак».
**00.20** «Адзін дзень. Новая версія».

### EUROSPORT

**04.00, 06.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 7-ы.
**09.30** Матаспартыўны часопіс.
**09.45** Футбол. Еўра-2012. Навіны.
**10.00** Снукер. Мастэрс (Шанхай, Кітай). Дзень 1-ы.
**12.30** Суперспорт. Чэмпіянат свету (Германія).
**13.15** Матаспартыўны часопіс.
**13.30** Веславанне. Чэмпіянат свету (Блед, Славенія).
**14.45** Конны спорт. Global Champions Tour (Рыа-дэ-Жанэйра, Бразілія).
**16.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету (Тэгу, Паўднёвая Карэя). Агляд.
**18.00, 02.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 8-ы.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.40** «Праведнікі», тэлесерыял: 6 серыя.
**08.25, 12.25** «Георгі і матылі», дак. фільм, 2004 г., Балгарыя–Канада–Фінляндыя–Галандыя–Нарвегія–Брытанія.
**09.15, 13.15** Размовы эксперта.
**09.35** «Мы тут больш не жывем», маст. фільм, 2004 г., ЗША.
**11.10** «Новы час», дак. фільм, 2010 г., Боснія і Герцагавіна.
**11.45** МакраФон: «Басовішча-2007», канцэрт гурта «Крамбамбуля»: ч. 2.
**12.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**13.35** «Мы тут больш не жывем», маст. фільм, 2004 г., ЗША.
**15.10** «Новы час», дак. фільм, 2010 г., Боснія і Герцагавіна.
**15.45** МакраФон: «Басовішча-2007», канцэрт гурта «Крамбамбуля», ч. 2.
**16.15** Невядомая Беларусь: «Як пошуг маланкі», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**16.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.00** «Мой родны горад», серыял: 2 серыя.
**17.20** Вагон.
**17.30** Невядомая Беларусь: «Еўрапейскі баль», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Праведнікі», тэлесерыял: 6 серыя.
**18.50** Невядомая Беларусь: «Як пошуг маланкі», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Еўропа сёння.
**20.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Чэрап», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Прыватная калекцыя.
**21.50** «Мы тут больш не жывем», маст. фільм, 2004 г., ЗША.
**23.25** Аб'ектыў.
**23.50** Гарачы каментар.

## 6 верасня, аўторак

---

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.20** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**08.35** Арэна.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Камедыйны серыял «Заклад» (Расія). 1-я серыя.
**10.55** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата « (Беларусь).
**11.45** Камандзіроўка.
**12.10** Ваенная драма «Дот» (Расія-Украіна).
**13.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**14.45** Дакументальны фільм «Глыбокае».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультсерыял «Гара Самацветаў».
**16.00** «Эпоха».
**17.00** Камедыйны серыял «Заклад» (Расія). 2-я серыя.
**17.55** «Пацалунак Сакрата « (Беларусь).
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** Трылер «Кома» (ЗША).
**23.30** Дзень спорту.
**23.45** Дак. цыкл «У пошуках ісціны».

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 19.30** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здарова!».
**10.20** «Дэтэктывы».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Таварышы паліцыянты». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Каралева экрану». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: Футбол. Адборачны матч чэмпіянату Еўропы. Боснія і Герцагавіна - Беларусь. Прамая трансляцыя.
**23.10** «На ноч глядзячы».
**00.10** «Таварышы паліцыянты». Шматсерыйны фільм.
**01.05** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**08.40** «Далёкія сваякі».
**08.55** Фільм «Шыза». Расія-Германія-Францыя-Казахстан, 2004 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** Фільм «Турэцкі гамбіт». 2005 г.
**16.00** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Машына для забойстваў»
**22.20** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Аўтапанарама».
**23.20** «Забойная сіла 6». Серыял.
**00.15** «Водбліскі». Серыял.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.15** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**10.10** Жансавет.
**10.45** «Трэці званок для дваіх». Дак. фільм.
**11.20** Рэальны свет.
**11.50** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.35** Авертайм.
**13.05** «Лабірынты: сеча пад Хоцінам, або апошні бой гетмана».
**13.35** «Бацькі і дзеці». 1-я серыя.
**15.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Футбол. Чэмпіянат Еўропы U-21. Адборачны раўнд. Беларусь-Германія. Прамая трансляцыя.
**21.10** Калыханка.
**21.25** Тэлебарометр.
**21.30** КЕНО.
**21.35** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.30** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**23.15** Спорт-кадр.
**23.45** Рэальны свет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Галубка».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Прамы эфір».
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**21.30** Тэлесерыял «Галубка».
**23.20** Прэм'ера. Тэлесерыял «Асобы, якіх ахоўваюць».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** Прэм'ера. «Закладніцы. Маршальскія жонкі».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Кватэрнае пытанне».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.05** Сёння.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** Серыял «Спроба да ўцёкаў».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Марскія д'яблы».
**21.20** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.30** Дэтэктыўны серыял «Алібі» на дваіх».

### EUROSPORT

**04.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 8-ы.
**06.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 8-ы.
**09.30** Снукер. Мастэрс (Шанхай, Кітай). Дзень 2-і.
**12.30** Веславанне. Чэмпіянат свету (Блед, Славенія).
**13.30** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 8-ы.
**14.10** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**14.45** Снукер. Мастэрс (Шанхай, Кітай). Дзень 2-і.
**17.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 16-ы этап.
**18.35** Футбол. Еўра-2012. Навіны.
**18.45** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 9-ы.
**02.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 9-ы.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Одры Гэпбэрн», біяграфічная меладрама, 1999 г., ЗША: 1 серыя.
**09.10** «Мой родны горад», серыял: 2 серыя.
**09.35** Еўропа сёння.
**10.05** Невядомая Беларусь: «Еўрапейскі баль», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**10.35** Прыватная калекцыя.
**11.00** «Ранча», серыял: 43 серыя.
**11.45** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**11.55** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Чэрап», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**12.30** «Одры Гэпбэрн», біяграфічная меладрама, 1999 г., ЗША: 1 серыя.
**14.05** «Мой родны горад», серыял: 2 серыя.
**14.30** Еўропа сёння.
**15.00** Невядомая Беларусь: «Еўрапейскі баль», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**15.30** Прыватная калекцыя.
**15.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**16.00** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Чэрап», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**16.30** «Бульбаны», мультсерыял.
**16.40** Без рэтушы: «Удар з-за мяжы», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**17.00** «Мой родны горад», серыял: 3 серыя.
**17.20** Вагон.
**17.30** «Чарнобыль для Еўропы», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Арол», серыял: 6 серыя.
**19.05** Невядомая Беларусь: «Свята на нашай вуліцы», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Праект «Будучыня».
**20.25** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Асабісты капітал.
**21.40** Рэпартэр.
**22.05** «Дэтэрмінатар», серыял: 10 серыя.
**22.50** Басаножам па свеце.
**23.15** Аб'ектыў.
**23.40** Гарачы каментар.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 7 ВЕРАСНЯ, СЕРАДА

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.35** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Сфера інтэрасаў». Эканамічная праграма.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Камедыйны серыял «Заклад» (Расія). 2-я серыя.
**11.00** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата « (Беларусь).
**12.10** Камедыя « Афіцыянт з залатым падносам» (Расія).
**13.45** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**14.45** Відэафільм АТН «Кармянская скарбніца» цыклу «Зямля беларуская».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультсерыял «Гара Самацветаў».
**16.00** «Эпоха».
**16.55** Камедыйны серыял «Заклад» (Расія). 3-я серыя.
**17.55** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.45** Міжнародны музычны фэст «Крым Мюзік Фэст». Адкрыццё.
**00.50** Дзень спорту.
**01.00** Дак. цыкл «У пошуках ісціны».

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здорава!».
**10.20** «Дэтэктывы».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Таварышы паліцыянты». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Каралева экрану». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Справа была на Кубані». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Шматсер. фільм «У лясах і на гарах».
**23.10** Асяроддзе пасялення.
**00.10** «Таварышы паліцыянты». Шматсерыйны фільм.
**01.05** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**09.00** Фільм «Машына для забойстваў». Канада, 2010г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Забойчая сіла 6». Серыял.
**15.40** «Насланнe». Серыял.
**16.50** «Гаворыць і паказвае Мінск».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Зімовая спякота». Расія-Францыя-Іспанія-Бельгія, 2004г.
**22.20** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Дабро пажаліцца».
**23.20** «Забойчая сіла 6». Серыял.
**00.15** «Водблiскі». Серыял. Закл. серыя.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.00** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**10.05** Жансавет.
**10.40** Канцэрт Gven Stefani. Harajuku Lovers Live.
**12.20** Рэальны свет.
**12.50** Спорт-кадр.
**13.15** Лабірынты: Камянец-Падольскі.
**13.45** «Бацькі і дзеці» («Беларусьфільм»). 2-я серыя.
**15.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**20.00** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** Спортлато 5 з 36.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Канцэрт Gven Stefani. Harajuku Lovers Live.
**23.05** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**23.50** Рэальны свет.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Галубка».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Прамы эфір».
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**21.30** Тэлесерыял «Галубка».
**23.20** Прэм'ера. Тэлесерыял «Асобы, якіх ахоўваюць».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** Прэм'ера. «Гістарычны працэс».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Дачны адказ».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.05** Сёння.
**10.20** «Развод па-руску».
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** Серыял «Спроба да ўцёкаў».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Марскія д'яблы».
**21.20** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.30** Дэтэктыўны серыял «Алібі» на дваіх».

### EUROSPORT

**04.00, 06.00, 12.30** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Дзень 9-ы.
**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**10.00, 14.45** Снукер. Мастэрс (Шанхай, Кітай). Дзень 3-і.
**14.15** «Алімпійскія гульні». Часопіс.
**17.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 17-ы этап.
**18.35** Футбол. Еўра-2012. Навіны.
**18.45, 02.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Мужчыны. 1/4 фіналу.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Арол», серыял: 6 серыя.
**08.35** Невядомая Беларусь: «Як пошуг маланкі», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**09.05** Без рэтушы: «Удар з-за мяжы», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**09.25** «Мой родны горад», серыял: 3 серыя.
**09.50** Праект «Будучыня».
**10.20** Рэпартэр.
**10.40** Асабісты капітал.
**10.55** Хто ёсць кім?: «Алесь Бяляцкі – абаронца правоў чалавека».
**11.15** «Ранча», серыял: 44 серыя.
**12.00** Гісторыя пад знакам Пагон.
**12.10** Беларусы ў Польшчы.
**12.25** «Арол», серыял: 6 серыя.
**13.25** Праект «Будучыня».
**13.50** Невядомая Беларусь: «Як пошуг маланкі», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**14.25** «Мой родны горад», серыял: 3 серыя.
**14.50** Рэпартэр.
**15.15** Асабісты капітал.
**15.30** «Свята на нашай вуліцы», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**15.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**16.00** Хто ёсць кім?: «Алесь Бяляцкі – абаронца правоў чалавека».
**16.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**16.25** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў).
**16.45** «Бульбаны», мультсерыял.
**17.00** «Мой родны горад», серыял: 4 серыя.
**17.20** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**17.30** «Берасцейская крэпасць. Дзве абароны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Дэтэрмінатар», серыял: 10 серыя.
**18.55** Беларусы ў Польшчы.
**19.10** Асабісты капітал.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Навігатар.
**20.40** Хто ёсць кім?: «Алесь Бяляцкі – абаронца правоў чалавека».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Без рэтушы: «Дайсці да Плошчы», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**21.50** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 5 серыя.
**22.20** «Чарнобыль для Еўропы», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**22.50** Аб'ектыў.
**23.15** Гарачы каментар.

## 8 ВЕРАСНЯ, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.50** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Камедыйны серыял «Заклад» (Расія). 3-я серыя.
**11.00** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата « (Беларусь).
**12.10** Камедыя «Ты - мне, я - табе» (СССР).
**13.40** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**14.30** Відэафільм цыклу «Лёгка сказаць».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультсерыял «Гара Самацветаў».
**16.00** «Хочаш пачуць - паглядзі». Дакументальны фільм.
**16.25** Здароўе.
**17.00** Камедыйны серыял «Заклад» (Расія). 4-я серыя.
**17.55** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата « (Беларусь).
**18.50** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**21.55** Міжнародны музычны фэст «Крым Мюзік Фэст». Конкурс, дзень першы.
**01.00** Дзень спорту.
**01.15** Дак. цыкл «У пошуках ісціны»

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здорава!».
**10.20** «Дэтэктывы».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Таварышы паліцыянты». Шматсерыйны фільм.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Каралева экрану». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Справа была на Кубані». Шматсерыйны фільм.
**22.10** Шматсерыйны фільм «У лясах і на гарах». Заключныя серыі.
**00.10** «Таварышы паліцыянты». Шматсерыйны фільм.
**01.05** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**09.00** Фільм «Зімовая спякота». Расія-Францыя-Іспанія-Бельгія, 2004г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.30** Красуні! Міс-Мінск-2011.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Забойчая сіла 6». Серыял.
**15.40** «Насланнe». Серыял.
**16.50** «Мінск і мінчане».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Чорны рыцар». ЗША, 2001г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Аўтапанарама».
**23.20** «Забойчая сіла 6». Серыял.
**00.15** «Жорсткі бізнэс». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**10.10** Жансавет.
**10.45** Канцэрт «Bon Jovi. Lost Highway: The Concert».
**12.25** Рэальны свет.
**12.55** Страсці па культуры.
**13.35** «Бацькі і дзеці» («Беларусьфільм»). 3-я серыя.
**15.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**16.10** Медычныя таямніцы.
**16.45** Медычныя таямніцы +.
**17.00** Камедыйная меладрама «Анатомія Грэй-5» (ЗША). Заключная серыя.
**17.50** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Хакей КХЛ. Дынама (Мінск) - Лакаматыў (Яраслаўль). Прамая трансляцыя.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.20** Камедыйная меладрама «Анатомія Грэй-5» (ЗША). Заключная серыя.
**23.05** Час футболу.
**23.45** Міжнародны турнір на прызы Шчэрбы. Дзень 1-ы.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Галубка».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Прамы эфір».
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**21.30** Тэлесерыял «Галубка».
**23.20** Прэм'ера. Тэлесерыял «Асобы, якіх ахоўваюць».
**00.15** Навіны - Беларусь.
**00.25** Прэм'ера. «Паядынак».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «Таямнічая Расія».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі…».
**11.10** «Да суду».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** Серыял «Спроба да ўцёкаў».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Марскія д'яблы».
**21.20** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.05** Сёння.
**23.30** Дэтэктыўны серыял «Алібі» на дваіх».

### EUROSPORT

**04.00, 06.00, 12.30, 18.45** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Жанчыны. 1/4 фіналу.
**09.30** Футбол. Еўра-2012. Навіны.
**09.45** Вось дык так!!!
**10.00, 14.45** Снукер. Мастэрс (Шанхай, Кітай). Дзень 4-ы.
**17.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 18-ы этап.
**02.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Мужчыны. 1/4 фіналу.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Прыгоды пана Міхала», тэлесерыял: 5 серыя.
**08.05** «Дэтэрмінатар», серыял: 10 серыя.
**08.50** «Берасцейская крэпасць. Дзве абароны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**09.20** «Мой родны горад», серыял: 4 серыя.
**09.45** На колах.
**10.15** «Бронзавы жаўнер Алёша», дак. фільм, 2008 г., Эстонія.
**11.20** «Ранча», серыял: 45 серыя.
**12.10** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**12.30** Хто ёсць кім?: «Алесь Бяляцкі – абаронца правоў чалавека».
**12.45** «Дэтэрмінатар», серыял: 10 серыя.
**13.30** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.00** Без рэтушы: «Дайсці да Плошчы», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**14.25** «Мой родны горад», серыял: 4 серыя.
**14.50** «Берасцейская крэпасць. Дзве абароны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**15.20** Беларусы ў Польшчы.
**15.35** «Бронзавы жаўнер Алёша», дак. фільм, 2008 г., Эстонія.
**16.45** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**17.00** «Сонечная дзіда», серыял: 2 серыя.
**17.25** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**17.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** Хто ёсць кім?: «Алесь Бяляцкі – абаронца правоў чалавека».
**18.20** «Генерал Клеэбэрг і яго жаўнеры», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**19.10** Размовы эксперта (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.00** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Размовы эксперта (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**20.45** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.50** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Асколкі», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**22.35** «Д'ябалавы хітрыкі», серыял: 1 серыя.
**23.00** Аб'ектыў.
**00.05** Гарачы каментар.

## 9 ВЕРАСНЯ, ПЯТНІЦА

---

**06.00, 07.10, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.35** Навіны.
**07.05, 08.05** «Зона Х». Дарожныя навіны.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Камедыйны серыял «Заклад» (Расія). 4-я серыя.
**11.00** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**12.10** Дэтэктыў «Жыццё на дваіх» (Расія-Украіна).
**12.45** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**14.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Мультсерыял «Гара Самацветаў».
**16.00** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**16.50** Камедыйны серыял «Заклад» (Расія). 5-я серыя.
**17.45** Дэтэктыўны серыял «Пацалунак Сакрата» (Беларусь).
**18.40** Ведай нашых.
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Міжнародны музычны фэст «Крым Мюзік Фэст». Мега-канцэрт.
**00.50** Дзень спорту.
**01.00** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).

---

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.10** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.10** «Жыць здорава!».
**10.20** «Дэтэктывы».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закінуты свет». Шматсер. фільм.
**12.00** «Таварышы паліцыянты». Шматсерыйны фільм.
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Справа была на Кубані». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**22.10** Юбілейны фэст «КіВіН». Кубак уладальнікаў кубкаў.
**01.10** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** Фільм «Чорны рыцар». ЗША, 2001 г.
**10.40** «Нашы суседзі». Серыял.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Забойная сіла 6». Серыял.
**15.40** «Насланне». Серыял.
**16.50** «Я-вандроўца».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Манія велічы». Францыя-Італія-Іспанія, 1971 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** Фільм «Суседка». ЗША, 2004 г.
**01.20** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Музычная камедыя «Не бойся, я з табой» (СССР). 1-я і 2- я серыі.
**11.45** Рэальны свет.
**12.20** Час футболу.
**13.05** «Бацькі і дзеці» («Беларусьфільм»). 4-я серыя, заключная.
**14.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**15.30** Медычныя таямніцы.
**16.05** «Рукі прэч ад Місісіпі» (Германія).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.00** Прыгодніцкая камедыя «Дэні – шэзлонг, што лётае» (Аўстралія).
**21.00** Калыханка.
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.10** Камедыйная меладрама «Чаму мужчыны ніколі не слухаюць, а жанчыны не ўмеюць паркавацца» (Германія).
**00.00** Спартовая гімнастыка. Міжнародны турнір на прызы Шчэрбы. Дзень 2-і.
**01.35** Дыялогі аб рыбалцы.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** Тэлесерыял «Маршрут літасці».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Галубка».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.35** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.50** Тэлесерыял «Сёстры па крыві».
**18.50** «Прамы эфір».
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Прэм'ера. «Ефрасіння. Працяг». Тэлесерыял.
**21.30** Прэм'ера. «Юрмала-2011». Фэст гумарыстычных праграм.
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.300**Фільм «Помста». 2007г .

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** «І зноў добры дзень!».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Вочная стаўка».
**11.15** «Да суду».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** Серыял «Спроба да ўцёкаў».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Марскія д'яблы».
**21.15** Серыял «Глушэц. Вяртанне».
**23.05** Прэм'ера. Вострасюжэтны фільм «У тваіх вачах».
**00.45** Дэтэктыўны серыял «Алібі» на дваіх».

### EUROSPORT

**04.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Мужчыны. 1/4 фіналу.
**09.30** Вось дык так!!!
**09.45** Футбол. Еўра-2012. Навіны.
**10.00, 18.45** Снукер. Мастэрс (Шанхай, Кітай). Дзень 5-ы.
**12.30** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Мужчыны. 1/4 фіналу.
**14.45** Снукер. Мастэрс (Шанхай, Кітай). Дзень 5-ы.
**17.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 19-ы этап.
**20.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Мужчыны. 1/4 фіналу.
**21.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Жанчыны. 1/2 фіналу.
**01.00** Снукер. Мастэрс (Шанхай, Кітай). Дзень 5-ы.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар.
**07.35** «Бронзавы жаўнер Алёша», дак. фільм, 2008 г., Эстонія.
**08.40** МакраФон: «Новая традыцыя»: Канцэрт фалькорных гуртоў «Таўгая», «Яр» у студыі імя Лютоўскага на фестывалі «Новая традыцыя».
**09.20** «Мой родны горад», серыял: 2 серыя.
**09.45** Праект «Будучыня».
**10.10** Форум (ток-шоў): «Патрыёты і касмапаліты».
**10.55** Рэпартэр.
**11.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**11.30** Невядомая Беларусь: «Як пошуг маланкі», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**12.05** «Д'яблавы хітрыкі», серыял: 1 серыя.
**13.05** МакраФон: «Новая традыцыя»: Канцэрт фалькорных гуртоў «Таўгая», «Яр» у студыі імя Лютоўскага на фестывалі «Новая традыцыя».
**13.40** Без рэтушы: «Удар з-за мяжы», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**14.00** Праект «Будучыня».
**14.25** «Мой родны горад», серыял: 2 серыя.
**14.50** Форум (ток-шоў): «Патрыёты і касмапаліты».
**15.35** Рэпартэр.
**16.00** «Чарнобыль для Еўропы», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**16.30** «Расія. ХХ стагоддзе. Погляд на ўладу», 2009 г., Расія: ч. 1.
**17.00** «Між намі, буслямі», мультсерыял для дзяцей: 1 серыя.
**17.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.30** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**18.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**18.05** «Д'яблавы хітрыкі», серыял: 1 серыя.
**19.10** Асабісты капітал (эканамічная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.40** Гарачы каментар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.30** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.50** Невядомая Беларусь: «Мінск. Горад чужога сонца», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**22.20** «Пітбуль», серыял: 26 серыя.
**23.10** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**23.15** Аб'ектыў.
**23.40** Гарачы каментар.

## 10 ВЕРАСНЯ, СУБОТА

---

**07.00** Існасць.
**07.25** Добрай раніцы, Беларусь!
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.45** «Славянскі базар-2011».
**10.45** «Сваты-3». Камедыйны серыял (Украіна).
**12.10** Камедыйная меладрама «Службовы раман» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**16.50** Дакументальны фільм «Мінск - мая сталіца».
**17.15** «Славянскі базар-2011».
**17.40** Відэафільм АТН «Аблюбаваная зямля» цыклу «Зямля беларуская».
**17.55** Ваша лато.
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.20** Ведай нашых.
**19.30** Месца сустрэчы.
**21.00** Панарама.
**21.40** Міжнародны музычны фэст «Крым Мюзік Фэст». Конкурс, дзень другі.
**00.30** «Сваты-3». Камедыйны серыял (Украіна).

---

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** Фільм «Белае сонца пустэльні».
**12.40** Фільм «Красуня і мурзіла».
**14.10** «Хвіліна славы. Мары спраўджваюцца!».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Ералаш.
**16.50** Прэм'ера. Камедыя «Назад у СССР».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Здань оперы».
**22.15** «Пражэктарпэрысхілтан».
**22.50** Фільм «Запавет».
**01.00** Праграма «Ціхі дом» на Венецыянскім кінафэсце.

---

**07.00** «Гарачы лёд».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** Фільм «Манія велічы». Францыя-Італія-Іспанія, 1971г.
**09.40** «Чыстая праца».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Мінск і мінчане».
**11.10** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**11.35** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.55** Фільм «Нашы суседзі». СССР, 1957г.
**15.25** «Новыя падарожжы дылетанта».
**15.55** «Вялікі горад».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Наша справа».
**17.00** Фільм «Павадыр». Беларусь, 2001г.
**18.45** Красуні на сцэне і ў жыцці.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Міс-Мінск-2011». Фінальнае шоў.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** Фільм «Пакуль мы жывыя». Беларусь, 2008г.
**00.50** «Зорны рынг».
**01.45** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

---

**06.40** Прыгоды Агента 007. Фільм (ЗША-Вялікабрытанія).
**09.00** Жансавет.
**09.40** Дача здароўя.
**10.15** Прыгодніцкая камедыя «Дэні – шэзлонг, што лётае» (Аўстралія).
**12.15** Тэлебарометр.
**12.20** Дыялогі аб рыбалцы.
**12.55** Серыял «Маргоша» (Расія).
**16.55** Хакей КХЛ. Дынама (Мінск) - Металург (Магнітагорск). Прамая трансляцыя.
**19.15** Халі-галі. Скетч-шоў.
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Болтан - Манчэстэр Юнайтэд. Прамая трансляцыя.
**21.20** КЕНО.
**21.25** Тэлебарометр.
**21.30** Прыгоды Агента 007. Фільм (ЗША-Вялікабрытанія).
**23.55** Канцэрт «Celine Dion. A New Day Live».

### РОССИЯ

**07.00** «Уся Расія».
**07.10** «Юрмала-2011». Фэст гумарыстычных праграм.
**08.55** Камедыя «Бацькі і дзяды».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Помста». 2007 г.
**13.30** «Відавочнае-неверагоднае».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў». Аўтарская праграма.
**14.45** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**15.45** Фільм «Дваццаць дзён без вайны».
**17.40** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.40** Фільм «Дарагая мая дачушка». 2011 г.
**22.30** Тэлесерыял «Даішнікі».
**00.25** «Дзяўчаты».

### НТВ

**07.35** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Медыцынскія таямніцы».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** Прэм'ера. «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**15.10** «Жаночы погляд».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Таямнічая Расія».
**17.20** «Вочная стаўка».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.25** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.05** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.00** «Ты не паверыш!».
**22.55** «Апошнае слова». Вострасюжэтнае ток-шоў.
**23.55** «Нерэальная палітыка».
**00.25** Вострасюжэтны фільм «Адкупленне».

### EUROSPORT

**09.30** Снукер. Мастэрс (Шанхай, Кітай). 1/2 фіналу.
**12.30** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Жанчыны. 1/2 фіналу.
**14.45** Снукер. Мастэрс (Шанхай, Кітай). 1/2 фіналу.
**17.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 20-ы этап.
**18.45** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Мужчыны. 1/2 фіналу.
**01.00** Ралі. Ралійная серыя IRC. Дзень 1-ы.
**01.30** Снукер. Мастэрс (Шанхай, Кітай). 1/2 фіналу.
**02.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Жанчыны. Фінал.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.25** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**07.35** «Д'яблавы хітрыкі», серыял: 1 серыя.
**08.35** «Між намі, буслямі», мультсерыял для дзяцей: 1 серыя.
**09.00** Калыханка для самых маленькіх.
**09.25** Беларускія лёсы: «Каўчэг», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**10.00** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**10.30** Без рэтушы: «Дайсці да Плошчы», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**10.55** « Расія. ХХ стагоддзе. Погляд на ўладу», 2009 г., Расія: ч. 1.
**11.25** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**11.55** Госць «Белсату».
**12.10** Невядомая Беларусь: «Мінск. Горад чужога сонца», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**12.45** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**13.10** «Між намі, буслямі», мультсерыял для дзяцей: 1 серыя.
**13.35** Калыханка для самых маленькіх «Кастусь Шыдлоўскі».
**14.00** Форум (ток-шоў): «Патрыёты і касмапаліты».
**14.45** Госць «Белсату».
**15.05** «Наўскач», маст. фільм, 1995 г., Польшча.
**16.45** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**17.15** «Доктар Марцін», серыял: 1 серыя.
**18.00** «Я помнік сам сабе..», дак. фільм, 2009 г., Украіна.
**19.00** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**19.30** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.40** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.15** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**20.25** Беларускія лёсы: «Каўчэг», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Два на два (тэледыскусія).
**21.45** Суботні сеанс: «Хвацкая», маст. фільм, 1993 г., ЗША.
**23.30** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 2 серыя.
**00.15** Аб'ектыў.

## 11 ВЕРАСНЯ, НАДЗЕЛЯ

**Першы канал**

**06.05** Міжнародны музычны фэст «Крым Мюзік Фэст». Мега-канцэрт.
**08.45** Слова Мітрапаліта.
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.55** Фартыфікацыя.
**10.35** Відэафільм АТН «Аблюбаваная зямля» цыклу «Зямля беларуская».
**10.50** «Сваты-3». Камедыйны серыял (Украіна).
**12.10** Трагікамедыя «Радня» (СССР).
**14.05** Відэафільм АТН «На родзе напісана…».
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Меладрама «Трамвай у Парыж» («Беларусьфільм»). 1-я і 2-я серыі.
**17.25** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**18.10** Суперлато.
**19.20** Камедыйны баявік «Таксі-3» (Францыя).
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Міжнародны музычны фэст «Крым Мюзік Фэст». Зачыненне.
**00.45** «Сваты-3». Камедыйны серыял (Украіна).

**АНТ**

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня».
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** «Фазэнда».
**11.40** Фільм «Вакзал для дваіх».
**14.10** Драма «Хлопчыкі-дзяўчынкі».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Зваротны адлік».
**17.00** Прэм'ера. «За кулісамі «Вялікай розніцы».
**18.00** Прэм'ера. Меладрама «Дарагі Джон».
**20.00** Контуры.
**21.05** Прэм'ера. «Нона, давай!».
**21.40** Прэм'ера. «Вялікая розніца».
**22.45** Дэтэктыў «Аператыўная распрацоўка-2».
**00.25** Фільм «Прарок».

**СТВ**

**06.55** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**07.15** Фільм «Ас з асаў». Францыя - Германія, 1982г.
**09.00** «Аўтапанарама».
**09.25** «Вялікі сняданак».
**10.05** Красуні на сцэне і ў жыцці.
**10.45** «Міс-Мінск-2011». Фінальнае шоў.
**13.10** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**14.10** Фільм «Давай ажэнімся». СССР, 1982г.
**15.40** «Геніяльны шпік».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.55** Чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па футболе: ФК «Тарпеда» Жодзіна - ФК «Днепр» Магілёў. Прамая трансляцыя.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «На спіне ў чорнага ката». Беларусь, 2008г.
**22.25** «Прафесійны бокс».
**23.20** Фільм «Інсайт». Беларусь, 2009г.
**00.55** «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

**ОНТ**

**06.55** Прыгоды Агента 007. Фільм (ЗША-Вялікабрытанія).
**09.10** «Правы чалавека».
**09.25** Дабравест.
**09.50** Мір вашай хаце.
**10.00** Гаспадар.
**10.35** Тэлебарометр.
**10.40** «Рукі прэч ад Місісіпі» (Германія).
**12.35** Рэальны свет.
**13.10** «Страсці па культуры».
**13.55** Серыял «Маргоша» (Расія).
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Фулхэм - Блэкберн. Прамая трансляцыя.
**19.55** «Халі-галі». Скетч-шоў.
**20.15** Жывы гук.
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.10** Навіны надвор'я.
**21.40** Прыгоды Агента 007. Фільм (ЗША-Вялікабрытанія).
**00.00** Палітычны трылер «Паляванне Ханта» (ЗША-Харватыя).

**РОССИЯ**

**07.00** «ХА». Маленькія камедыі.
**07.25** Фільм «Дарагая мая дачушка». 2011 г.
**09.00** Тэлесерыял «Даішнікі».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Гістарычны фільм «Сямён Дзяжнёў».
**13.30** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.00** Весткі.
**14.15** «З новай хатай!».
**14.45** Прэм'ера. «Код малпы. Генетыкі супраць Дарвіна».
**15.35** «Рамантыка рамансa».
**16.25** Фільм «Тры таполі» на Плюшчысе».
**18.00** «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера. Фільм «Адплата за каханне». 2011 г.
**22.55** Прэм'ера. Фільм «Цытадэль 911».
**23.25** Фільм «Арэлі». 2007 г.

**НТВ**

**07.40** Дзіцячая раніца на НТБ-Беларусь.
**08.00** Сёння.
**08.20** «У зоне асаблівай рызыкі».
**08.50** «Першая перадача».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.55** «Дачны адказ».
**12.00** «Развод па-руску».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**15.00** Прэм'ера. «Чужыя дзеці».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Следства вялі…».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.45** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**21.55** «Ванга вяртаецца! Сакрэтны архіў прадракальніцы».
**23.05** «Нтвшнікі».
**00.00** Трылер «Вежы-двайняты».

**EUROSPORT**

**04.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Жанчыны. Фінал.
**09.30** Ралі. Ралійная серыя IRC. Дзень 1-ы.
**10.00** Снукер. Мастэрс (Шанхай, Кітай). Фінал.
**12.45** Аўтаспорт. Суперкубак Паршэ (Монца, Італія).
**13.30** Аўтаспорт. Міжнародны кубак Ле-Ман (Вялікабрытанія).
**15.00** Снукер. Мастэрс (Шанхай, Кітай). Фінал.
**17.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі. Іспанія. 21-ы этап.
**18.45** Аўтаспорт. Міжнародны кубак Ле-Ман (Вялікабрытанія).
**19.30** Ралі. Ралійная серыя IRC. Дзень 2-і.
**20.00** Матаспартыўны часопіс.
**20.15** Снукер. Мастэрс (Шанхай, Кітай). Фінал.
**21.00** Пляжны футбол. Кубак свету. Італія. Фінал.
**22.15** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Жанчыны. Фінал.
**23.30** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат ЗША (Нью-Йорк, ЗША). Мужчыны. Фінал.

**БЕЛСАТ tv**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.40** Госць «Белсату».
**07.55** «Доктар Марцін», серыял: 1 серыя.
**8 45 «Сонечная дзіда», серыял: 2 серыя.**
**09.15** Калыханка для самых маленькіх.
**09.40** «Я помнік сам сабе..», дак. фільм, 2009 г., Украіна.
**10.40** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**11.05** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 2 серыя.
**11.55** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма) «Бульбаны», мультсерыял.
**12.25** Два на два (тэледыскусія).
**12.50** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**13.20** «Сонечная дзіда», серыял: 2 серыя.
**13.45** Калыханка для самых маленькіх.
**14.10** Прыватная калекцыя (агляд культурных падзеяў) .
**14.30** «Доктар Марцін», серыял: 1 серыя.
**15.20** «Хвацкая», маст. фільм, 1993 г., ЗША.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.15** «Праведнікі», тэлесерыял: 7 серыя.
**18.05** Два на два (тэледыскусія).
**18.30** «Рэвалюцыянеры», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**19.30** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** «Робэрт Кенэдзі – канец амерыканскае мары», дак. фільм, 2009 г., Францыя.
**20.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**22.00** Фільматэка майстроў: «Амалья», драма, 2008 г., Партугалія.
**00.05** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**00.15** Тыдзень у «Аб'ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца магчыма на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029)) 604 34 57, Юрый;
Мінск: (8029) 178 31 68 Вольгв
Бабруйск (8029) 628 75 01 Вольга
Слуцк (8044) 755 66 48 Марына

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

Падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |
| | | | | |

Плательщик

Пеня ________

Кассир Всего ________

**Для тых, хто прымае рашэнні!**
Новы час
**www.novychas.org**

ПРАЕКТ

# ЦЮРКСКАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ



Тэрыторыя пражывання цюркскіх народаў — Туран



Тая ж карта са сцягамі цюркскіх дзяржаўных утварэнняў

Алег НОВІКАЎ

**У Баку абмяркоўваюць праект канфедэрацыі Азербайджану з Турцыяй. Эксперты губляюцца ў здагадках, што гэта — містыфікацыя, шантаж суседзяў ці сапраўды аднаўленне міфічнай дзяржавы Туран?**

«Гарантыяй бяспекі азербайджанскай рэспублікі можа стаць ваенны саюз з Турцыяй, а пазней — стварэнне канфедэратыўнай азербайджана-турэцкай дзяржавы», — з такім аналізам сітуацыі ў рэгіёне выступіла блізкая да прэзідэнта Аліева газета «Азадлыг». Нататка ў «Азадлыг» стала прадметам для шматлікіх каментараў. Сапраўды, калі верыць выданню, гэта першы крок па стварэнню адзінай дзяржавы цюркаў, пра што даўно марылі панцюркісты.

Наогул, панцюркізм як цэльная канцэпцыя паўстаў у канцы XIX стагоддзя сярод казанскіх татараў. Галоўны пастулат — рэанімацыя міфічнага цюркскага каганата Туран. Пазней тэорыя была развіта «младатуркамі» ў Турцыі. Вядомым ідэолагам панцюркістаў з'яўляўся Тэкін Альп, які заклікаў стварыць суперімперыю — Вялікі Туран ад Ціхага акіяна да Балтыкі і Адрыятыкі. Знакам цюркскай расы мела быць ваўчыца (Bozkurt), празначаная ў працах панцюркістаў як маці нацыі (у цюркаў панаваў культ ваўчыцы да прыняцця ісламу).

У выніку Першай сусветнай вайны Асманская імперыя, якой кіравалі младатуркі, як вядома, распалася. Узніклая на развалінах імперыі Турэцкая Рэспубліка будавалася на аснове свецкага нацыяналізму. Панцюркісцкая дактрына была амаль забытая і нават зрабілася забароненым вучэннем. Невялікі рэнесанс яна перажыла на мяжы 1930–1940-х, калі Турцыя падумвала падтрымаць Гітлера ў вайне з СССР. Агрэсія туркаў на Каўказ павінна была ісці пад лозунгамі вызвалення братэрскіх цюркскіх народаў.

Новае адраджэнне панцюркізму пачалося пасля Другой сусветнай вайны, калі Турцыя стала адыгрываць важную ролю ў блоку NATO. Дэмакратычная партыя, якая знаходзілася ва ўладзе ў Турцыі ў 1949–1960 гадах, выкарыстоўвала ў сваім ідэйным арсенале некаторыя напрацоўкі панцюркізму.

Аднак яўнае дамінаванне Савецкага Саюза не пакідала гэтым колам ніякай тэарэтычнай магчымасці для рэалізацыі сваіх ідэй. З узнікненнем новых незалежных цюркамоўных дзяржаў Цэнтральнай Азіі і Закаўказзя перад Анкарой замаячыў новы шанец. Напачатку 1990-х зноў адраджаюцца традыцыйныя панцюркісцкія ідэі пра стварэнне Вялікага Турана. Замест слоў «азербайджанец», «узбек», «кіргіз», «татарын» і іншых для пазначэння этнічнай прыналежнасці сталі ўжывацца такія словазлучэнні, як «азербайджанскі турак», «узбекскі турак», «кіргізскі турак», «крымскі турак».

У кастрычніку 1992 года ў Анкары адбылася сустрэча на вышэйшым узроўні, у якой удзельнічалі тагачасны прэзідэнт Азербайджана Абульфаз Эльчыбей, прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў, прэзідэнт Кіргізіі Аскар Акаеў, прэзідэнт Туркменістана Сапармурат Ніязаў і прэзідэнт Узбекістана Іслам Карымаў.

Але цюркскага адзінства не атрымалася. Анкара ўздымала пытанне пра наднацыянальную цюркскую эканамічную прастору, і нават вызначэнне агульнай мовы для цюркскіх дзяржаў. Лідары ж цэнтральнаазіяцкіх рэспублік бачылі галоўную задачу толькі ў каардынацыі сумеснай дзейнасці. А канец 1990-х гадоў наогул стаў часам глыбокага крызісу практычнага панцюркізму. Кіраўніцтва новых незалежных дзяржаў з насцярогай паставілася да лініі Анкары на замяшчэнне месца «старэйшага брата». Плюс палітычная мадэль Турцыі, якая прадугледжвае ратацыю ўлады па выніках выбараў, не вельмі цікавіла эліты былых савецкіх рэспублік.

Анкара, тым не менш, не адмовілася цалкам ад палітыкі, накіраванай на аб'яднанне цюркамоўных народаў. Адмысловая роля надаецца так званым «курултаям братэрства і супрацоўніцтва», якія праходзяць рэгулярна. Дадатковым кірункам узмацнення культурнага ўплыву Турцыі на цюркамоўныя краіны служыць лацінізацыя алфавітаў. У Расійскай федэрацыі спроба такога кшталту была здзейсненая ў Татарстане, але Канстытуцыйны суд РФ блакаваў яе.

І вось пасля 20 гадоў працы з'явіўся канкрэтны вынік. Баку, здаецца, гатовы на канфедэрацыю з Анкарой. Так далёка не заходзіў нават былы азербайджанскі прэзідэнт Эльчыбей, які лічыўся фанатычным панцюркістам.

Аднак пакуль тон у каментатарах задаюць песімісты. Уся справа ў тым, што артыкул у «Азадлыг» з'явіўся пасля перапалкі з Тэгеранам. 8 жніўня начальнік галоўнага штаба Узброеных сіл Ірана падверг крытыцы ўрад Азербайджана за «мерапрыемствы, якія супярэчаць прынцыпам ісламу». Гаворка пра перaслед у Азербайджане ісламістаў. Ён папярэдзіў, што Ільхама Аліева чакае горкая будучыня, калі той не паставіцца сур'ёзна да яго заявы. Быццам тая пагроза іранскага генерала і выклікала прыліў панцюркісцкіх настрояў у адміністрацыі Аліева.

Другі фактар — цяперашняя пазіцыя Расіі ў карабахскім пытанні. Сустрэча прэзідэнтаў Расіі і Азербайджана, прысвечаная карабахскаму канфлікту, якая адбылася ў Сочы ў сярэдзіне жніўня, у цэлым расчаравала азербайджанскае грамадства. Масква дала не толькі зразумець, што яна супраць сілавой спробы рашэння карабахскай праблемы. Палітолагі сцвярджаюць, што Аліеву нагадалі, чым закончылася для Грузіі авантура ў Цхінвалі.

«Такога кшталту заявы — гэта дэманстрацыя крыўды на Расію за карабахскае пытанне. Азербайджанскае кіраўніцтва абвясціла шматвектарнасць палітыкі — вось і спрабуе яе неяк дэманстраваць Маскве. Для ўраўнавbooking пагроз, і не толькі, можна выказаць здагадку, што будзе далейшае збліжэнне Баку і Анкары, але да стварэння канфедэрацыі справа не дойдзе», — піша расійская «Незалежная газета».

У Маскве таксама спасылаюцца на тое, што месца панцюркізму ў сучаснай ідэалогіі кіруючага турэцкага класа прыкметнае, але далёка не самае галоўнае. Гэта толькі адзін з элементаў сцвярджэння замежнай палітычнай лініі ды ўплывы Анкары.

Як бачым, у песімістаў дастаткова сур'ёзныя падставы не верыць у пражэкт стварэння Турану. Хаця ўжо сама дыскусія ў Баку наконт інтэграцыі з Турцыяй вельмі яскравы сігнал, што панцюркісцкая опцыя ў азербайджанскай эліце існуе. І відавочна, яна будзе набываць большую папулярнасць хаця б з-за таго, што ў Азербайджане апошнім часам назіраецца станаўленне ісламскага праіранскага падполля. Паколькі аўтарытарны рэжым Аліева карыстаецца падтрымкай Захаду, моладзь бачыць адзіную грамадскую альтэрнатыву ў іранскай мадэлі. Таму турэцкі вопыт барацьбы за свецкую мадэль дзяржавы можа быць хутка запатрабаваны.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Глыбокі эканамічны крызіс у краіне не замінае прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку рыхтавацца да хуткіх парламенцкіх выбараў. Грамадскае аб'яднанне «Белая Русь», якому даўно прадказваюць статус партыі, нарэшце заявіла пра сваю гатоўнасць ёю стаць. Аналізуючы выказванні мясцовых ідэолагаў, эксперты прагназуюць змены ў беларускім выбарчым заканадаўстве. Праз год (да канца верасня 2012 года) у Беларусі павінны адбыцца парламенцкія выбары. Падысці да іх Беларусь можа са зменeным выбарчым заканадаўствам.

**«Независимая газета» (Расія)**

Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка бравіраваў сваім статусам самага лепшага сябра Расіі і выпатрабаваў за гэтыя прапагандысцкія выказванні шэраг бясплатных крэдытаў, спісанні запазычанасцяў, танны газ. З расійскага боку адміністрацыя Ельцына хацела паказаць, што курс на разбурэнне постсавецкай прасторы завершаны. Усё гэта было несур'ёзнай палітычнай гульнёй. І калі да ўлады прыйшоў Пуцін і рубам паставіў пытанне пра нашу інтэграцыю, заклікаў да знакамітай фразы «аддзяліць мух ад катлет», мы ўбачылі, што Лукашэнка не гатовы ісці на сур'ёзныя інтэграцыйныя крокі. Відавочна, што ўжо існуючую базу Саюзнай дзяржавы можна выкарыстоўваць як пляцоўку для абмеркавання тых ці іншых праблем. Аднак пра рэальнае аб'яднанне Расіі і Беларусі, як яно задумвалася 15 гадоў таму, хутчэй за ўсё, варта забыцца.

**«Голос Росии» (Расія)**

МВФ будзе абмяркоўваць пытанне пра выдачу Беларусі крэдыту, у якім яна мае вялікую патрэбу. Гэта рашэнне можа адыграць ключавую ролю для захавання ўлады Лукашэнкі. Лукашэнка просіць у МВФ 8 мільярдаў долараў. Але Беларусь пакуль ледзь распачынае нейкія эканамічныя рэформы, на якіх настойвае міжнародная супольнасць. Меркаванні ў МВФ падзяліліся: адны лічаць, што крэдыт без рэформаў заахвоціць Лукашэнку працягваць цяперашні эканамічны курс і рэпрэсіі, іншыя мяркуюць, што адмова МВФ яшчэ глыбей «штурхне» беларускага дыктатара ў абдымкі Расіі.

**«Independent» (Вялікабрытанія)**

За дваццаць гадоў размоваў пра расійскі выбар «Бацька» падсадзіў краіну на іголку маскоўскіх «інтэграцыйных» крэдытаў і давёў яе эканоміку да поўнага маразму. Украінскія кіраўнікі разам з дружалюбнымі ім алігархамі проста разрабавалі тэрыторыю, якая ім дасталася. Зараз беларускі «калгас» падазрона нагадвае украінскі «абшчак».

**«Остров» (Украіна)**

Інфляцыя ў краіне перавысіла 50%, і няма ніякіх перадумоў для яе зніжэння. Як будзе развівацца сітуацыя, не можа прагназаваць нават міністэрства эканомікі краіны. Нейкую выразнасць у сітуацыю павінна было ўнесці пасяджэнне па сацыяльна-эканамічным развіцці з удзелам прэзідэнта Лукашэнкі, якое прайшло ў чацвер. Але замест пэўнага плану дзеянняў на валютным рынку і выразнай эканамічнай стратэгіі беларусы зноў атрымалі набор абяцанняў, што сітуацыя выправіцца на працягу двух месяцаў. А шэраг мер да і пасля нарады сігналізуе, што змяняць ніхто нічога не плануе.

**«Новые известия» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ЛІВІЯ. КАДАФІ БЫЎ ЗАКАХАНЫ Ў КАНДАЛІЗУ РАЙЗ?

Як вядома, у рукі паўстанцаў трапіў урадавы квартал лівійскай сталіцы, у тым ліку рэзідэнцыя Муамара Кадафі. Тут інсургенты знайшлі шмат цікавых рэчаў. Напрыклад, фотаальбом з выявамі Кандалізы Райз, былога дзяржаўнага сакратара ЗША ў часы прэзідэнта Буша-малодшага. Гэты альбом даў падставу журналістам згадаць адносіны паміж Муамарам і Кандалізай і заключыць, што палкоўнік меў асабісты інтарэс да амерыканскага чыноўніка. Напрыклад, у сваіх інтэрв'ю ён неаднаразова адзначаў высокі прафесіяналізм працы міс Райз. Калі ў 2008-м Кондзі (мянушка палітыка) наведала Лівію, Кадафі зрабіў ёй падарунак на суму 210 тысяч долараў, які, праўда, яна браць адмовілася. Сярод іншага ў камплект сувеніраў уваходзіла алмазнае калье і залаты медальён з выявай палкоўніка. Таксама ўсе звярнулі ўвагу на тое, што Кадафі падчас перамоваў называў Кандалізу «Ліза». Наўрад ці паміж палітыкамі мог быць інтым, аднак тое, што Кадафі не роўна дыхаў адносна Кондзі, відавочна.

**Па матэрыялах «Le Monde» (Францыя)**

### РАСІЯ. ЭКСТРЭМІСТАЎ БУДУЦЬ ЛЯЧЫЦЬ У ВАР'ЯТАРНЯХ?

На сайце расійскага МУС з'явіўся праект федэральнага закона «Пра асновы сістэмы прафілактыкі правапарушэнняў у Расійскай Федэрацыі», які прадугледжвае вядзенне індывідуальнай працы з патэнцыйнымі парушальнікамі. Да прафілактыкі правапарушэнняў адносяцца таксама «прымусовыя меры медыцынскага характару». Такога кшталту прафілактыка ўключае «амбулаторнае лячэнне ў псіхіятра, знаходжанне ў псіхіятрычным стацыянары, у тым ліку з інтэнсіўным назіраннем». На думку праваабаронцаў, гэта не што іншае, як вяртанне карнай псіхіятрычнай медыцыны часоў СССР. «Суд можа прыняць рашэнне пра правядзенне псіхіятрычнага абследавання за супрацьпраўнае дзеянне. Але што ў дадзеным законе пад ім разумеецца? Калі пад правапарушэннем разумеецца іншадумства, то гаворка ідзе пра карную псіхіятрычную медыцыну, якая ўжывалася ў Савецкім Саюзе», — кажа адзін з юрыстаў-праваабаронцаў. Сітуацыя яшчэ больш крытычная з-за таго, што, па законе, над бальніцамі няма грамадскага кантролю. Адпаведна, іх не могуць правяраць праваабаронцы. Пакуль лёс новага закону не зразумелы. Між тым, адзін з дырэктараў адной з маскоўскіх псіхіятрычных клінік ананімна прызнаўся: «У выпадку прыняцця закону мы будзем лячыць не ад шызафрэніі, а па прысуду суда».

**Па матэрыялах расійскай прэсы**

### ІРАК. ГЕНІТАЛЬНЫ ДЖЫХАД

Іракскія ісламісты пратэстуюць супраць рашэння рэгіянальнага парламенту Курдскай Аўтаноміі, які па ініцыятыве праваабарончых арганізацый забараніў практыку пашкоджання жаночых геніталій, гаворка пра жаночае абразанне. Адпаведна стэрэатыпам, дзякуючы аперацыі жанчына быццам губляе цікавасць да сэксу і канцэнтруе ўсю ўвагу на сям'і. Практыка абразання, або, як яго называюць, FGM, існуе ў шматлікіх краінах Усходу. Прыняты іракскімі курдамі закон стаў першым законам супраць FGM у рэгіёне Блізкага Усходу. Нядзіўна, што яго прыняцце выклікала мабілізацыю кансерватараў. На іх думку, пасля прыняцця закону ўсе сем'і ў Іраку могуць развальіцца з-за няверных жонак. «Ці хочаце вы згубіць сям'ю?» — такім чынам гучыць лозунг кампаніі, якую на днях распачалі кансерватары. У сваю чаргу, прыхільнікі новага закону спасылаюцца на ісламаведаў, якія за год да прыняцця рашэння спецыяльна разглядзелі гэта пытанне і вырашылі, што жаночае абразанне не адпавядае ісламскай традыцыі. Абразанне ўзнікла значна раней за з'яўленне ісламу.

**Па матэрыялах «Jungle World» (Германія)**

### ГЕРМАНІЯ. ЧАГО МОЖА КАШТАВАЦЬ ПАШТОЎКА ДА ФІДЭЛЯ



У нямецкай партыі Левыя магчымы раскол. Да яго спрычыніўся віншавальны ліст, які Клаус Эрнст даслаў на адрас Фідэля Кастра з нагоды ягонага 85-годдзя. Тэкст віншавання нагадвае афіцыйную перапіску паміж ГДР і Кубай у часы халоднай вайны. Лідары Левых лічаць Кубу «прыкладам для народаў усяго свету» і г.д. У дадатак аўтары здымаюць адказнасць з ГДР за будаўніцтва берлінскай сцяны, якую, дарэчы, пачалі ўзводзіць роўна 50 гадоў таму. Падобны лексікон адразу выклікаў пратэсты з боку часткі партыйцаў, якія хацелі, каб Левыя парвалі са сталінскай традыцыяй. Антысталіністы кажуць пра тое, што «некаторыя кіраўнікі пакутуюць на нарцысізм». Ці закончыцца канфлікт партыйным расколам, цяжка сказаць. Аднак ён дакладна можа паўплываць на выніку берлінскіх муніцыпальных выбараў 18 верасня. Берлінскія Левыя ў адкрытым лісце да кіраўніцтва выступілі супраць віншаванняў Кастра і прапанавалі даць ацэнку кубінскаму рэжыму і берлінскай сцяне.Тым часам, адпаведна апытанням каналу RTL, пасля ліста ў Гавану папулярнасць партыі скарацілася на адзін працэнт і складае зараз сем працэнтаў.

**Па матэрыялах нямецкай прэсы**

ЦІКАВА



# КАМАНДАНТЭ КАМІЛА

**Алег НОВІКАЎ**

**Пасля Чэ Гевары, Фідэля Кастра, субкамандантэ Маркаса Лацінская Амерыка падаравала свету чарговага рэвалюцыянера.**

Сёння пра Камілу Вальеха гаворыць уся Лацінская Амерыка. Яе называюць новым сімвалам лацінаамерыканскай рэвалюцыйнай традыцыі, хаця яна сама не вельмі падобна на сваіх славутых папярэднікаў. У яе няма барады Кастра або маскі субкамандантэ Маркаса. Затое ў яе ў носе ёсць срэбны пірсінг (на гэта сярод лацінаамерыканскіх тынейджараў зараз татальная мода).

Яшчэ шэсць месяцаў таму ніхто нават добра не ведаў яе імя. 23-гадовая Каміла была студэнткай геафака сталічнага ўніверсітэта Чылі, якую адрознівала ад аднагодкаў хіба што большая цікавасць да палітыкі. З-за таго, што яе бацькі былі камуністамі і трапілі пад каток рэпрэсій у часы Піначчэта, яна рана пачала цікавіцца гэтай тэматыкай. Калі вырасла, запісалася ў камсамол пры мясцовай Кампартыі, а пасля стала камуністкай.

Адначасова яна зрабіла кар'еру ў студэнцкім нацыянальны прафсаюзе Федэрацыі студэнтаў Чылі (FECh). Шэсць месяцаў таму яе абралі на пасаду старшыні. Тады пра яе ўпершыню ўзгадала мясцовая прэса. Правая «La nation» напісала, што абранне камуністкі на пасаду FECh не абяцае нічога добрага.

Таму журналісту з «La nation» можна спакойна прапаваць экстрасэнсам-прадказальнікам. У пачатку лета Каміла заклікала да нацыянальнага студэнцкага страйку з патрабаваннямі палепшыць якасць адукацыі, адчыніць больш дзяржаўных ВНУ (палова ўніверсітэтаў у Чылі прыватныя), скарацiць колькасць элітных каледжаў, куды доступ зачынены для выхадцаў з малазабяспечаных сямей.

Увогуле, Чылі — вельмі палітызаваная краіна. Забастоўкі і дэманстрацыі тут звычайны элемент грамадскага жыцця. Аднак Каміла здолела выклікаць такі бунт, які Чылі, па словах архіварыусаў, не бачыла з канца 1980-х (у гэты час было шмат дэманстрацый за сыход Піначчэта). Каля ста ўніверсітэтаў былі акупаваныя ў першыя дні забастоўкі. 30 чэрвеня на вуліцы выйшлі 200 тысяч чалавек. Прэзідэнт быў вымушаны нешта прапанаваць, аднак яго ініцыятывы FECh успрыняла скептычна.

Страйк працягваўся. На 19 ліпеня было акупавана ўжо 149 будынкаў ВНУ. 4 жніўня пратэст набыў форму адкрытай канфрантацыі з паліцыяй. У Санцьяга быў ужыты газ. Каля 800 чалавек былі арыштаваныя. Дзеянні ўладаў выклікалі вялікі рост сімпатый да студэнтаў. Нацыянальны прафсаюз публічных чыноўнікаў і прафсаюз транспартнікаў правялі 24 і 25 жніўня забастоўкі салідарнасці. У сталіцы акцыя закончылася патасоўкай з паліцыяй, у выніку чаго 16-гадовы хлопец быў забіты.

Па аналогіі з падзеямі ў Вялікабрытаніі ў 1970-я гады, калі прафсаюзы актыўна ўмешваліся ў палітыку, падзеі лета 2011-га ў Чылі ў прэсе называлі «чылійская зіма».

Гэта ўсё выклікала драматычны абвал даверу да ўраду і прэзідэнта. У жніўні 81 працэнт чылійцаў пазітыўна ставіўся да патрабаванняў пратэстуючых студэнтаў. У той жа час урад і прэзідэнт карысталіся падтрымкай толькі 16 працэнтаў электарату.

У выніку ўрад пагадзіўся ўключыць у канстытуцыю пункт пра тое, што кожнаму гарантуецца якасная адукацыя. Адначасова рэфармавана сістэма крэдытавання вышэйшай адукацыі. Цяпер чылійскія платнікі плацяць банкам 2 (а не 6, як раней) працэнта гадавых. У дадатак Міністэрства адукацыі атрымала дадатковыя 2 мільярды долараў на мадэрнізацыю ВНУ.

Зараз эмоцыі трохі супакоіліся, хаця сцвярджаць, што ў чылійскіх універсітэтах зноў спакойна, нельга. Варта згадаць, што Каміла — камуністка і ўвесь час намагаецца навязаць студэнцкай масе больш глабальныя антыкапіталістычныя лозунгі. «Нашто нам патрэбная адукацыя? Каб атрымаць прыбытак? Каб рабіць бізнес? Адукацыя патрэбная нам, каб развіваць нашу краіну, стварыць сістэму сацыяльная інтэграцыі. Гэтая тэма нават не абмяркоўваецца», — кажа яна.

Так ці інакш, студэнцкі рух, відавочна, атрымаў калі не канчатковую, то часовую перамогу. А яго медыя-сімвалам, безумоўна, была студэнтка з геаграфічнага факультэту. У час страйку яе з ранку да ночы круцілі па тэлебачанні, бралі інтэрв'ю, заклікалі на розныя шоў. У краіне пачалася нейкая каміламанія. У гонар актывісткі нават пачалі складаць песні. У інтэрнэце можна знайсці мноства сайтаў, прысвечаных Каміле. Іх стваральнікі часам блытаюць сімпатыі да палітычных поглядаў Камілы і асабістыя пачуцці.

Між тым, культ Камілы пераступіў мяжу. У еўрапейскай прэсе пачалі з'яўляцца першыя публікацыі пра незвычайнага лідара чылійскіх левых. Віцэ-прэзідэнт Балівіі назваў яе «самым прыгожым лідарам нашага вялікага паўстання». А гісторыкі пішуць, што левая ідэя на кантыненце атрымала незвычайны шарм. У якім накірунку пойдзе каміламанія, цяжка сказаць. Шмат будзе залежыць ад самой камандантэ Камілы, як яе жартам называюць у прэсе. Яна ж кажа, што хоча займацца палітыкай.

Застаецца дадаць, што бум папулярнасці Камілы прапарцыйны росту нянавісці з боку яе апанентаў. Правая прэса нават піша, што ў тварах Камілы ёсць нешта ад д'ябла. Менавіта таму яна, быццам, здольная падпарадкоўваць столькі людзей. У жніўні міністр культуры нават публічна заклікала забіць Камілу, каб супакоіць студэнцкія аўдыторыі. Гэтыя словы каштавалі ёй міністэрскага партфеля. Напрыканцы лета, пасля таго, як Каміла атрымала дзяжурную порцыю ананімных лістоў, у якіх ёй пагражалі смерцю, Канстытуцыйны суд вырашыў даць ёй асабістую ахову.

АГЛЯД

# ПАСЛЯ ТРЫПАЛІ

Алег НОВІКАЎ

**Францыя — галоўны ініцыятар udараў войкаў NATO па Кадафі, святкуе крах лівійскай дыктатуры. На думку экспертаў, перамога будзе мець важныя наступствы для краіны і Еўропы. Прапануем агляд французскай прэсы.**



Калі браць голую статыстку, то канфлікт Парыжу і Кадафі можна смела ставіць у вайсковыя падручнікі ў раздзел «Ідэальная вайна». Супрацьстаянне цягнулася толькі 6 месяцаў. Каштавала бюджэту амаль нічога (200 мільёнаў еўра). Людскія страты — мінімальныя.

Праўда, быў адзін непрыемны эпізод. У сярэдзіне лета наступленне паўстанцаў, якім дапамагала авіяцыя NATO, захлынулася. Лаяльныя Кадафі сілы нават час ад часу пераходзілі ў контрнаступленне. Адпаведна, над Аленам Жупэ, міністрам абароны Францыі, збіраліся хмары. Увесну, калі толькі пачыналіся бамбардзіроўкі пазіцый кадафістаў, ён абяцаў вырашыць усе праблемы з дыктатарам за адзін тыдзень. Аднак, насуперак яго прагнозам, вайна зацягвалася, а дыктатар і не думаў сыходзіць.

Але ў выніку ўсё закончылася добра. Зараз інсургенты дабіваюць рэшткі кадафістаў. Сам палкоўнік, калі верыць французскім медыя, хаваецца ў Алжыры. Што тычыцца Алена Жупэ, ён спачывае на лаўрах. На думку прэсы, яго рашучасць выратавала аўтарытэт усяго Еўрапейскага Саюза. «Паразу заходняй кааліцыі можна было разглядаць як правал васковага патэнцыялу ўсёй Еўропы», — адзначае вядучы блогу «Secret defense».

І наадварот, перамога ў Лівіі можа значыць вялікія змены ў знешняй палітыцы Еўрапейскага Саюза. П'ер Русэлан з сайту «Geopolitique» піша: «У Еўрапейскага Саюза пасля Лівіі з'явіўся сапраўдны шанец для рэформы ўсяго знешнепалітычнага курсу. Тое, што адбылося ў Трыпалі, вельмі важна для Еўропы. Падзенне тыраніі можа па іншаму вызначыць нашыя адносіны з арабскім светам». Русэлан, як і іншыя правыя аналітыкі, заклікаюць Брусэль не выводзіць войскі з Лівіі, каб гарантаваць там грамадскую бяспеку, а таксама не дапусціць актывізацыі ісламістаў. Праўда, не зразумела, ці здольная Еўропа, якая таксама змагаецца ў Афганістане, праявіць такую палітычную волю.

Дарэчы, пра палітычную волю. Уплывовы «Le Monde» атакуе Кэтрын Эштан, прадстаўніка ЕС па пытаннях абароны і бяспекі, за няздольнасць аператыўна прымаць рашэнне пра падтрымку паўстанцаў. Газета лічыць, што ў яе проста няма асабістых якасцяў для такой пасады. Аўтар сцвярджае, што адсутнасць у ЕС рашучых палітыкаў і механізмаў прыняцця аператыўных рашэнняў ёсць хвароба, якую ён называе «эштанізацыя».

Крытыка на адрас кіраўніцтва ЕС, на думку шмат каго, можа справакаваць авантурныя крокі з яго боку. Газета «Sunny Hundal» усур'ёз баіцца, што Брусэль, які аканфузіўся ў Лівіі, можа аказаць вайсковую падтрымку маніфестантам у Сірыі, калі яны афіцыйна папросяць такую дапамогу. Прыхільнікі ідэй пацыфізму на старонках «Humanite» таксама б'юць трывогу. Яны не бачаць нічога пазітыўнага ў тым, што ракеты NATO падалі на мірных жыхароў Трыпалі. Яны лічаць, што існуе небяспека ператварэння лівійскай кампаніі ў сталую практыку, калі NATO будзе дапамагаць апазіцыі паветранымі ўдарамі без уліку таго, што ахвярамі тых удараў могуць стаць цывільныя людзі. Дарэчы, сярод правазнаўцаў сапраўды ўжо ідзе дыскусія наконт таго, па якіх крытэрах можна кваліфікаваць урад паўстанцаў як нацыянальны ўрад.

Пакуль Кэтрын Эштан хавае вочы, Нікаля Сарказі ператварыўся ў героя нацыі. Прэса лічыць, што рэнаме пераможцы Кадафі будзе абавязкова выкарыстана ім у ходзе стартуючай прэзідэнцкай кампаніі. Рэйтынг прэзідэнта сапраўды пайшоў угору.

Ускосна гэта таксама звязана з тым фактам, што Лівія мае каласальныя запасы нафты. Думка пра тое, што Францыя зможа стаць прыярытэтным партнёрам новай лівійскай улады і галоўным інвестарам ў мясцовую эканоміку захапіла розумы простых французаў. Як пішуць гісторыкі, атмасфера чымсьці нагадвае эпоху каланіяльных захопаў, калі навіна пра прыяднанне чарговай заморскай калоніі выклікала грамадскі псіхоз. Эксперты спрабуюць ахаладзіць эйфарыю, кажуць, што амерыканцы не дапусцяць французскай манаполіі на лівійскія карысныя выкапні. Нельга забываць пра Італію — былога каланізатара Лівіі, — якая традыцыйна мае тут свае інтарэсы. Аднак пакуль ідэя хуткай таннай нафты з Лівіі працягвае валодаць масамі.

Левая апазіцыя, назіраючы за трыумфам ураду і адміністрацыі, скрыгае зубамі. Ёй застаецца толькі ўвесь час нагадваць пра тое, што за адзін месяц да пачатку мяцяжу ў Бенгазі Нікаля асабіста сустракаўся з Кадафі і цісную яму руку. Апазіцыйны рэсурс «Sarcofrance» сцвярджае: менавіта Францыя ў маі 2010 года пралабіравала ўключэнне Лівіі ў склад савету па правах чалавека пры ААН. На думку журналіста, вайна з Лівіяй была адчайнай спробай Сарказі рэабілітаваць сябе ў вачах егіпецкага і туніскага народаў за падтрымку мясцовых дыктатур. Як вядома, Францыя да апошняга спрабавала захаваць пры ўладзе туніскага дыктатара Бен Алі. Ёсць чуткі, што Сарказі ўлетку перапужаўся, што вайна, да эскалацыі якой ён прыклаў руку, зацягнецца і будзе дорага каштаваць для яго выбарчай кампаніі. Быццам ён дасылаў спецыяльных эмісараў у Трыпалі і вёў сакрэтныя перамовы з палкоўнікам.

Існуе яшчэ адна фракцыя, не задаволеныя тым, што ўсе лаўры дасталіся Сарказі. Гэта французскія інтэлектуалы, якія прыпісваюць перамогу над Кадафі сабе. Паводле часопісу «L'Express», якраз дзякуючы ціску грамадскай думкі Нікаля Сарказі пагадзіўся прызнаць апазіцыйны нацыянальны савет. Рэдактар згаданага часопісу Крыстоф Барбье ахвотна распавядае, як ён доўга асабіста схіляў Сарказі да прыняцця фатальнага рашэння наконт прызнання апазіцыі.

Так ці інакш, нельга не пагадзіцца з «Observateur»: «Дзякуючы вайне Еўропа атрымала ў асобе Нікаля Сарказі новага лідара, здольнага рэфармаваць яе палітыку». Пытанне толькі ў тым, ці скарыстаецца Сарказі шансам.



## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ВІКТАР ЯНУКОВІЧ



Прэзідэнт Украіны напярэдадні дня незалежнасці падчысціў спіс асобаў, якія маюць званне герой Украіны. Так, з яго канчаткова прыбралі Сцянапа Бандэру і Рамана Шухевіча — вядомых украінскіх нацыяналістаў. Затое спецыяльным указам прэзідэнта званне героя далі шмат каму. Сярод іх сапраўды годныя асобы кшталту славутага ўкраінскага актора Багдана Ступкі. Аднак ёсць таксама фігура, узнагароджанне якой выклікала татальнае неразуменне грамадства. Гэта Барыс Білаш, сябра Януковіча, экс-дэпутат Вярхоўнай Рады. Білаш атрымаў зорку героя за сваю паэтычную творчасць, хаця паэт з яго, мякка кажучы, дзіўны. Вось прыклад яго творчасці: «Если стану я нардепом // обеспечу свой народ // салом, яйцами и хлебом // пусть потешит свой живот // завалю печеньем, кексом // хочешь торт, трюфели на // если надо то и сексом // угощу его сполна». Праўда, асабліва дзівіцца тут няма чаму. Білаш, як і Януковіч, мае дыплом Міжнароднай Каліфарнійскай Акадэміі Навук, якой на самай справе не існуе.

### МІШЭЛЬ БАЧМАН



Сябра кангрэса ЗША прэтэндэнт на тое, каб стаць кандыдатам у прэзідэнты ад Рэспубліканскай партыі, якая прадстаўляе ультракансерватыўную фракцыю, вельмі добра пачала кампанію. У штаце Айова, дзе ў наступным годзе стартуюць нацыянальныя праймерыз, яна перамагла ў дэбатах сваіх двух канкурэнтаў. Аднак цяпер яна сама спатыкнулася. Усё з-за ўрагану Ірэна, які прайшоўся па Усходняму ўзбярэжжу краіны. Бачман заявіла, што ўраган — чорная метка ад Бога для палітыкаў у Вашынгтоне. Фраза дорага каштавала палітыку, паколькі катастрофа, якая, адпаведна Бачман, Божы промысел, прынесла як мінімум дзясятак смярцей. У выніку кансерватарка была вымушана прызнаць, што тыя словы былі жартам. Аднак такое прызнанне выклікала новую хвалю крытыкі, цяпер ужо з боку шматлікіх хрысціянскіх медыя. На іх думку, жартаваць пра Бога — чыстае блюзнерства. Застаецца дачакацца вынікаў апытанняў, каб даведацца, як гэта гісторыя адбілася на рэйтынгу Бачман. Дарэчы, на мінулым тыдні ў выбарчую гонку ўступіў таксама тэхаскі губернатар Рык Перы, адзін з фаварытаў праймерыз.

### ГІДА ВЕСТЭРВЕЛЕ



Міністр замежных спаў ФРГ, былы старшыня ліберальнай Партыі свабодных дэмакратаў (FDP) можа страціць пасаду дырэктара МЗС. Нямецкая прэса сцвярджае, што фракцыя FDP у Бундэстагу пачала тайныя дэбаты наконт вотуму недаверу міністру. У партыі відавочна незадаволеныя былым асцярожным падыходам Вестэрвеле да ідэі ўдзелу нямецкіх жаўнераў у лівійскім канфлікце. Цяпер відавочна, што ўдзел войскаў NATO ў ліквідацыі рэжыму Кадафі дапамог прыпыніць масавыя забойствы. Нават называюцца асобы, якія могуць бліжэйшым часам замяніць Гіда. Гэта, перш за ўсё, цяперашні дзяржаўны міністр Вернер Хойер (Werner Hoyer). У адказ на такія спекуляцыі кіраўніцтва кажа, што Вестэрвеле працягне займаць пасаду да канца цяперашняй парламенцкай кадэнцыі. Эксперты ж лічаць, што на лёс Гіда паўплываюць прызначаныя на 18 верасня выбары ў Берліне. Калі лібералы іх прайграюць, МЗС Германіі атрымае новага кіраўніка.

МЕМУАРЫ

# БЕЛАРУСЬ МЯНЯЕ АРЫЕНЦІРЫ

Леанід ЛЫЧ

Заканчэнне.
Пачатак у №№30, 31

**Пра неабходнасць захавання і шырокага выкарыстання нацыянальных моваў у грамадскім жыцці даволі часта гаварыў і пісаў сам Гарбачоў. Гэта не магла не выкарыстаць рэдакцыя самай папулярнай сярод творчай інтэлігенцыі Беларусі газеты «Літаратура і мастацтва».**

## Статус мовы

Газеце пашчасціла, што ў той адказны, складаны адраджэнскі час за галоўнага рэдактара быў таленавіты паэт, публіцыст цвёрдай нацыянальнай арыентацыі Анатоль Вярцінскі. Ён не пабаяўся змясціць у красавіку 1989 года і мой даволі вялікі артыкул «Беларускай мове — статус дзяржаўнай», у якім абгрунтоўвалася, што толькі ў такім рангу ёй будзе забяспечана і выжыванне, і прэстыжнасць.

Праз год пасля XIX Усесаюзнай канферэнцыі КПСС былі створаны Беларускі Народны Фронт (25–27 чэрвеня 1989 года, Вільнюс) і Таварыства беларускай мовы (27 чэрвеня 1989 года), якія ўзначальвалі гісторык Зянон Пазьняк і паэт Ніл Гілевіч. Але самае важнае, што тварам да беларускай мовы зноў павярнуліся самыя высокія партыйныя і савецкія органы. Яе рэальнае становішча ў грамадскім жыцці было такім запрыгоненым, а нацыянальна-моўная свядомасць людзей такой нізкай, што ўжо ніякім творчым аб'яднанням аказалася б зусім не пад уладным зрабіць роднае слова беларусаў галоўным сродкам камунікацыі ва ўсіх сферах дзейнасці чалавека. Тут патрэбен быў сур'ёзны клопат самой дзяржавы. І яна нарэшце ўзялася за справу, нягледзячы на ўпартае супраціўленне тых, хто ўжо даўно адарваўся ад родных каранёў, не валодаў і не збіраўся вывучаць беларускую мову, якой, як усё часцей і часцей заяўлялася, дзеля выратавання і надання заслужанай прэстыжнасці неабходна надаць статус дзяржаўнай.

У дакладзе «Аб нацыянальнай палітыцы партыі ў сучасных умовах», зробленым на верасьнёўскім (1989) Пленуме ЦК КПСС, Міхаіл Гарбачоў сказаў: «Перш за ўсё мы зыходзім з таго, што карэннае насельніцтва ўсіх рэспублік, безумоўна, мае поўнае права зацвердзіць сваю мову ў якасці дзяржаўнай, інакш кажучы, стварыць прававыя ўмовы для яе захавання і развіцця. Гэта не толькі юрыдычнае пытанне. Гэта пытанне палітычнае, паколькі размова ідзе аб самаадчуванні нашых народаў, іх зразумелым імкненні захаваць сваю нацыянальную незалежнасць».

На гэтую ўстаноўку не магло не прарэагаваць партыйнае кіраўніцтва Беларусі, якое да




**Апагеем стала прыняцце 26 студзеня 1990 года чатырнаццатай сесіяй ВС БССР адзінаццатага скліканя закона «Аб мовах у Беларускай ССР»**

таго ж яшчэ вострa крытыкавалі прагрэсіўныя колы грамадства за ўпартае нежаданне надаць мове сваёй тытульнай нацыі цалкам правамерны для яе статус дзяржаўнай. Але моўная залежнасць КПБ ад агульнасаюзнага партыйнага цэнтра вымусіла яе супраць уласнага жадання згадзіцца на наданне беларускай мове статусу дзяржаўнай. Упершыню пра гэта было сказана ў прынятай 27 снежня 1989 года на XVI пленуме ЦК КПБ пастанове «Аб платформе Кампартыі Беларусі да выбараў народных дэпутатаў Беларускай ССР і мясцовых Саветаў рэспублікі». Ужо аднаго гэтага факта дастаткова для таго, каб бачыць у гарбачоўскай перабудове надзейную выратавальную сілу для беларускай мовы, што непазбежна клала канец русіфікацыі беларускага народа. Па гэтай прычыне беларус не мае права негатыўна ставіцца да перабудовы, і дарэмна пра яе мы сёння так рэдка ўзгадваем, асабліва ў пазітыўным плане. Ніводнаму з савецкіх народаў яна не была так патрэбна, як беларусам, бо яны бліжэй за ўсіх знаходзіліся ад небяспечнай мяжы поўнай русіфікацыі.

Без перабольшвання апагеем перабудовы стала прыняцце 26 студзеня 1990 года чатырнаццатай сесіяй Вярхоўнага Савета Беларускай ССР адзінаццатага склікання закона «Аб мовах у Беларускай ССР», у адпаведнасці з якім беларуская мова аб'яўлялася адзінай дзяржаўнай у рэспубліцы. Без перабудовы нам ніколі не ўдалося б усталяваць такую справядлівасць у моўнай палітыцы. Зараз яна ўжо нічым не адрознівалася ад такой палітыкі ўсіх еўрапейскіх краін з адным тытульным народам.

З перабудовай самым непасрэдным чынам звязана прыняцце такіх гістарычнай важнасці дакументаў, як Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР (27 ліпеня 1990 года), Закон «Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі» (25 жніўня 1991 года), пастановы «Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларускай ССР» (26 жніўня 1991 года), ратыфікацыя 10 снежня 1991 года Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь, падпісанага ў Віскулях Расіяй, Украінай і Беларуссю пагаднення аб утварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

## Нацыянальныя нігілісты

Стваральнай дзейнасці прагрэсіўных колаў беларускага грамадства, якой не наканавана было доўжыцца і дзясятка гадоў, паклаў канец злашчасны майскі рэферэндум 1995 года. Патаемная мэта яго — недапушчэнне беларускай мовы ў афіцыйнае жыццё з тым, каб тут, як і за царскім, савецкім часамі, бесканкурэнтна панавала руская мова. На дзень правядзення рэферэндуму (14 мая) сярод тагачаснага зрусіфікаванага чыноўніцтва праціўнікаў беларускай мовы мелася ў сотні разоў больш, чым яе шчырых прыхільнікаў. Гэта бясконца радавала вышэйшае кіраўніцтва краіны, бо давала яму поўную надзею на падтрымку шматлікім страшэнна зрусіфікаваным бюракратычным апаратам усіх неабходных мерапрыемстваў па спыненню далейшага ўкаранення беларускай мовы ва ўсе сферы дзейнасці чалавека, як таго патрабаваў прыняты закон «Аб мовах у Беларускай ССР». Дасягнуўшы такога, меркавалася затым замяніць рускай мовай беларускую і там, куды яе ўжо паспелі ўвесці.

Каб надаць рэгуляванню моўнага пытання дэмакратычны характар, праз старанна падрыхтаваны рэферэндум. У дзеянне было пушчана ўсё, што толькі магло дапамагчы атрымаць у народа згоду на ўсталяванне юрыдычнай роўнасці беларускай і рускай моваў. З вясны самых высокіх дзяржаўных дзеячаў і ўзятых імі на службу інтэлігентаў няспынна

**Сапраўдны бой рэферэндуму далі толькі дэпутаты ВС ад Беларускага Народнага Фронту, чым навекі праславілі сябе як шчырыя змагары за беларускае нацыянальна-культурнае Адраджэнне**

сыпаліся абяцанкі, што такая роўнасць абавязкова забяспечыць паралельнае выкарыстанне гэтых моваў у грамадскім жыцці. Людзям ніхто не патлумачыў, як такое будзе канкрэтна ажыццяўляцца на практыцы і ці магчыма ўвогуле падобная роўнасць. У нерэальнасць таго, што абяцалі людзям ідэолагі, арганізатары рэферэндуму, верыў увесь чыноўніцкі апарат, асабліва яго самыя высокія звёны, але сказаць праўду народу не пажадалі. Перашкодзіла невылечная хранічная хвароба — нацыянальны нігілізм.

Сапраўдны бой рэферэндуму далі толькі дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай ССР ад Беларускага Народнага Фронту, чым навекі праславілі сябе як шчырыя змагары за беларускае нацыянальна-культурнае Адраджэнне. Для гэтага яны лепшага сродку, апроч галадоўкі, не бачылі. Пачалі такую акцыю ў самой зале пасяджэнняў Вярхоўнага Савета. Спецслужбы жорстка расправіліся з галадоўцамі, нягледзячы на іх статус дэпутацкай недатыкальнасці. Дэпутат Валянцін Голубеў у час размовы з журналістам Аляксандрам Фядутам расказаў наступнае. Людзі ў чорнай спартыўнай форме і масках «кінуліся на першыя рады, а спераду сядзеў Пазьняк. Яны Пазьняку пачалі рваць рот, тыкаць у вочы пальцы.

(...) Мяне першым вырвалі з крэсла, і два чалавекі крутанулі мне рукі ўгару так рэзка, што я, стоячы на нагах, стукнуўся галавой аб падлогу. У гэты момант мне дубінкай выцялі па пазваночніку. І я проста перастаў адчуваць ногі».

Такой цаной за галадоўку расплаціліся і ўсе астатнія дэпутаты. Іх сілай закінулі ў машыны і адвезлі па розных адрасах.

Прыклад дэпутатаў паказвае, якім нячыстым, злачынным шляхам ішла да рэферэндуму Рэспубліка Беларусь. Усіх іх мы маем права называць не толькі шчырымі змаганцамі, але і вялікімі пакутнікамі за беларускую мову. Надыдзе час, і іх пайменна будзе ведаць кожны школьнік краіны.

## Горш як за савецкім часам

Пройдзеныя пасля майскага рэферэндуму гады не маюць сабе роўных па маштабнасці разбурэння культурна-моўнага патэнцыялу беларускага народа. Яго родная мова занесена ЮНЕСКА ў лік мёртвых моваў, з-за невыкарыстання яе ў афіцыйным жыцці кіраўніцтва радыёстанцыі «Нямецкая хваля» па-руску транслюе свае перадачы на Беларусь. Несусветны парадокс: падчас фашысцкай акупацыі ў Мінску па-беларуску вучылася больш дзяцей, чым сёння ў незалежнай, суверэннай Рэспубліцы Беларусь! Прагрэсіўная грамадскасць велізарнай колькасці краін планеты Зямля заклапочана насоўваннем на іх глабалізацыйных патокаў, робіць захады па мінімізацыі іх шкоднага ўздзеяння на нацыянальныя культуры і мовы, а на Беларусі не ж уласныя ўлады займаюцца русіфікацыяй тытульнага народа. У дачыненні да роднай мовы ўжо практычна цалкам анямелі чыноўніцкі апарат і шматлікая афіцыйная інтэлігенцыя. Да таго часу, пакуль беларуская мова не стане сапраўднай гаспадыняй у сваёй краіне, алагічна гаварыць пра яе цывілізаванасць.

Пра ўсё гэта трэба добра ведаць як палітычным дзеячам, так і інтэлектуалам. Толькі родная мова, з'яўляючыся генафондам беларускай нацыі, у стане забяспечыць ёй самабытнасць і сапраўдны росквіт. На любой чужой, нават самай багатай у свеце мове, беларусы не ў стане развязаць гэтую лёсавызначальную для іх праблему. Усцешна, што чалавецтва ніколі не спыняецца ў сваім паступальным развіцці. Сёння, мо як ніколі раней, яно вызначаецца вялікай інтэнсіўнасцю, што дазваляе меркаваць пра непазбежнасць прыходу на Беларусь новай перабудовы, у чымсьці падобнай і непадобнай на папярэднюю.

Таму архіважным з'яўляецца грунтоўны аналіз палітыкамі, навукоўцамі, грамадска-культурнымі дзеячамі ўсіх плюсаў і мінусаў яе. Гэтаму варта было б прысвяціць навукова-практычныя канферэнцыі, сімпозіумы, «круглыя сталы» і г. д. Трэба ж нарэшце разабрацца, чаму мы так марудзілі ў параўнанні з іншымі тытульнымі народамі саюзных рэспублік, праводзячы перабудову, чаму не забяспечылі надзейнымі людзьмі тыя дзялянкі грамадскага жыцця, ад функцыянавання якіх у найбольшай ступені залежыць нацыянальна-культурнае адраджэнне. Гэта — міністэрствы адукацыі і культуры, сродкі масавай інфармацыі, вышэйшая і сярэдняя спецыяльная школа. Многія з занятых тут людзей проста ў штыкі сустрэлі перабудову. Варта было б абмеркаваць, і чаму мы так хутка страцілі тое станоўчае, што прынесла з сабой перабудова.

З моцна асіміляваным, гістарычна бяспамятным народам няпроста развязваюцца нават самыя элементарныя пытанні нацыянальнага жыцця. Гарбачоў не памыляўся ў сваім сцвярджэнні: «Пазбаўце чалавека магчымасці гаварыць і пісаць на роднай мове, ведаць гістарычны шлях, эпас свайго народа, і ён, якіх бы поспехаў ні дасягнуў у матэрыяльных адносінах, ужо бязродны, а значыць, і бездухоўны». Ужо адных гэтых слоў дастаткова, каб з вялікай пашанай ставіцца да гарбачоўскай перабудовы, асабліва нам, беларусам, многіх з якіх школа, тэхнікумы, інстытуты (універсітэты) не навучылі гаварыць і пісаць на роднай мове, выбілі з галоў гістарычную памяць. Але і пры такім мізэрным нацыянальным рэсурсе неадарваныя ад родных каранёў колы беларускага грамадства не павінны адмаўляцца ад самаадданага змагання за яго перабудову, ачышчэння ад шкоднага ўздзеяння дзяржаўнай русіфікатарскай палітыкі. Будучыя пакаленні скажуць «дзякуй!» не яе ідэолагам і непасрэдным праваднікам, а тым, хто гатовы ахвяраваць нават сваім жыццём дзеля выратавання беларускага народа ад пагібелі ў чужой для яго культурна-моўнай стыхіі. Паколькі сёння Беларусь знаходзіцца ў стане моўнага бедства, яе нацыянальна зарыентаваныя сілы не маюць права спачываць на лаўрах.

ВАЙНА

# ТРАГЕДЫЯ ЗАХОДНЯЙ АСОБАЙ…

Ігар КУЗНЯЦОЎ

**Перад вайной у Чырвонай Арміі адной з самых моцных па баявому складу, падрыхтоўцы і колькасці войскаў лічылася Заходняя Асобая ваенная акруга (ЗахАВА).**



Ігар Кузняцоў

У яе склад уваходзілі: стралковых карпусоў — 8; стралковых дывізій — 24; механізаваных карпусоў — 6; танкавых дывізій — 12; матарызаваных дывізій — 6; кавалерыйскіх карпусоў — 1; кавалерыйскіх дывізій — 2; паветрана-дэсантных карпусоў — 1; паветрана-дэсантных брыгад — 3; умацаваных раёнаў — 9. На стыку ЗахАВА і Кіеўскай АВА, на рацэ Прыпяць, базаваліся караблі Пінскай ваеннай флатыліі (ПВФ).

Усяго ЗахАВА налічвала: 672 000 вайскоўцаў, 19 519 памежнікаў, 2 300 маракоў. На ўзбраенні войскаў акругі знаходзілася: 10 087 прылад і мінамётаў (без 50-мм мінамётаў), 2201 танк (у тым ліку 383 КВ і Т–34), 1909 самалётаў, у тым ліку знішчальнікаў — 855 (253 новых), франтавых бамбавікоў — 466 (139 новых), штурмавікоў — 85, далёкіх бамбавікоў — 336, самалётаў-карэктоўшчыкаў — 13, выведнікаў — 154 (24 новых) самалёта.

Што ж адбылося, чаму кадравыя, баяздольныя злучэнні Чырвонай Арміі, якія мелі дастатковую колькасць баявой тэхнікі, пацярпелі цяжкую паразу ў памежных баях?

Многія вядомыя палкаводцы ў сваіх мемуарах неаднаразова аналізавалі прычыны. На першае месца трэба паставіць палітычную памылку І.В. Сталіна, Савецкага ўрада ў вызначэнні тэрмінаў нападу фашысцкай Германіі.

Маршал Савецкага Саюза К.А. Мерацкоў (у 1941 годзе намеснік народнага камісара абароны СССР), успамінаючы сваю размову з І.В. Сталінам, напачатку лютага 1941 года пісаў: «...І.В. Сталін заўважыў, што знаходзіцца па-за вайной да 1943 года мы, вядома, не здолеем, нас уцягнуць міжволі. Але не выключана, што да 1942 года мы не будзем ваяваць».

Гэты пункт гледжання шмат у чым і вызначыў асноўную лінію нашай ваеннай дзейнасці. Быў узяты курс на найхутчэйшае пераўзбраенне арміі, фарсіраванне будаўніцтва ваенных аб'ектаў. Да заходніх межаў пачалося перакідванне стратэгічных рэзерваў з глыбіні краіны.

Не выключаны і такі варыянт, што СССР рыхтаваўся першым нанесці ўдар па войсках фашысцкай Германіі, ведаючы, што ваеннае сутыкненне паміж нашымі краінамі непазбежнае.

Першай стратэгічнай мэтай дзеянняў Чырвонай Арміі варта паставіць разгром галоўных сіл нямецкага войска, што разгортвалася на поўдзень ад Брэсту, Дзэмбліну, і выхад да 30 дня паўночней рубяжу Астраленка, р. Нарэў, Ловіч, Лодзь, Крэйцбург, Опельн, Оламаўц...

Найбліжэйшая задача — разбіць германскія войскі на ўсход ад ракі Вісла і на Кракаўскім кірунку выйсці на рэкі Нарэў і Вісла.

Значыць, распрацоўкі адносна прэвентыўнага ўдару ў Генеральным штабе існавалі. Тады становяцца яснымі многія факты — велізарнае засяроджванне войскаў у Беластоцкім выступе, выгоднае для наступальных дзеянняў, падцягванне стратэгічных рэзерваў нашых войскаў да заходніх межаў, адсутнасць мінавання і загараджэння найбольш небяспечных памежных рубяжоў абароны, блізкае размяшчэнне складоў каля дзяржаўнай мяжы. Становяцца зразумелымі і шматлікія забароны, якія ўводзяцца ў войсках, каб ніякае самае дробнае непаразуменне не змагло ўчасна развязаць вайну.

Усе гэтыя ўказанні, якія паступалі зверху, прытуплялі пільнасць ваеннага кіраўніцтва акруг, душылі яго ініцыятыву, прымушалі ўвесь час пры вырашэнні шматлікіх пытанняў азірацца на Маскву: а што скажуць там?

Тым не менш, у наяўнасці злачынная халатнасць вышэйшага камандавання Чырвонай Арміяй, якое не здолела пераканаць палітычнае кіраўніцтва краіны, і ў першую чаргу І.В. Сталіна, у гатоўнасці Германіі да нападу на СССР менавіта ў чэрвені 1941 года і якое не прыняло многіх захадаў, што залежалі менавіта ад яго, па ўмацаванні абараназдольнасці нашай краіны.

Істотным фактарам сталася адсутнасць дасведчанага, навучанага каманднага складу ва ўсіх звёнах кіраўніцтва Чырвонай Арміі. У выніку масавых рэпрэсій ва Узброеных Сілах СССР, асабліва ў 1937–1938 гадах, ахвярамі лжывых даносаў і самаўпраўнасці органаў АГПУ, НКУС сталі выбітныя палкаводцы і военачальнікі, якія атрымалі пэўны баявы досвед на палях бітваў Першай сусветнай вайны, грамадзянскай вайны, падчас баёў у Іспаніі, Фінляндыі, з японскімі мілітарыстамі. Пад рэпрэсіі з мая 1937-га па кастрычнік 1938 года ў Чырвонай Арміі патрапілі больш за 40 000 кадравых камандзіраў усіх рангаў.

Перад вайной у ЗахАВА 62,5% камандзіраў карпусоў мелі стаж кіраўніцтва меней аднаго года, 31,2% — меней двух гадоў і толькі 6,3% — два гады і больш. Сярод камандзіраў дывізій 63,5% мелі стаж меней года, 28,8% — да двух гадоў, 7,7% — два гады і больш. Ды і сам камандуючы ЗахАВА генерал войска Д.Г. Паўлаў не меў баявога досведу камандавання не толькі войскам, але нават корпусам і дывізіяй.

Тэарэтыкі, ГШ памылкова лічылі, што ў пачатковы перыяд вайны (15–20 дзён) баявыя дзеянні будуць праходзіць у абмежаваных маштабах пры адначасовым правядзенні мабілізавання, засяроджвання і разгортвання галоўных сіл армій.



Фактар раптоўнасці нападу… Пра яго шмат гаварылася і пісалася. Але ці быў напад фашысцкай Германіі раптоўным?

Так, ён быў раптоўным для нашых войскаў, для ўсяго савецкага народа, але не для вышэйшага камандавання Чырвонай Арміі. Пры наяўнасці магутнай тэхнікі, сродкаў нападу суперніка велізарнае значэнне мае своечасовае атрыманне часткамі і злучэннямі загаду пра прывядзенне ў баявую гатоўнасць да неадкладнай арганізацыі баявых дзеянняў.

Выведкай Чырвонай Арміі былі своечасова выкрытыя каля нашых заходніх межаў групоўкі нямецкіх войскаў, іх склад, паведамляўся нават час верагоднага нападу. Ці ведала пра яго наша вышэйшае ваеннае кіраўніцтва?

Вядома, ведала, але ігнаравала відавочныя факты. Таму і не былі своечасова прыведзеныя ў баявую гатоўнасць нашы войскі, таму і сустрэлі вайну шматлікія часткі і злучэнні ў месцах сваёй сталай дыслакацыі.

Вось і панеслі войскі Чырвонай Арміі, а ў прыватнасці войскі ЗахАВА — Заходняга фронту, велізарныя, неўзнаўляльныя страты.

У пачатковы перыяд вайны (22.6–9.7) з 44 дывізій Заходняга фронту: 24 разгромлены (10 стралковых, 8 танкавых, 4 мотастралковых, 2 кавалерыйскіх дывізіі); ВПС фронту пазбавіліся 1797 баявых самалётаў.

З ранейшага складу ЗахАВА засталося толькі 16 аслабленых дывізій, усяго 8 з іх мелі колькасць 30–50%, астатнія — атрады ў некалькі сотняў чалавек без цяжкага ўзбраення і баявой тэхнікі.

У раёне Беласток–Навагрудак у палон патрапілі 328 898 байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі, у раёне Магілёва, Оршы, Смаленску — 310 000 чалавек.

Былі і шматлікія іншыя прычыны, якія адмоўна паўплывалі на ход баявых дзеянняў:

- празмернае перабольшанне моцы савецкіх Узброеных Сіл;
- сур'ёзныя пралікі, дапушчаныя ў дыслакацыі і засяроджванні войскаў, авіяцыі памежных акруг;
- нізкая баявая гатоўнасць частак, злучэнняў і іх штабоў;
- камандаванне фронтам, арміі і іх штабы не мелі досведу і цвёрдых навыкаў у падрыхтоўцы аперацый і кіраванню імі;
- увядзенне зверху розных забаронаў — «да адмысловых указанняў»;
- недастатковая маскіроўка ваенных аб'ектаў, сістэм пунктаў кіравання і сувязі, негатоўнасць сістэм сувязі да вядзення баявых дзеянняў.



Генерал Дзмітрый Паўлаў

Можна назваць таксама дрэнны стан дарожнай сеткі ў заходніх раёнах, разгубленасць, баязлівасць, здраду, няўменне некаторых камандзіраў кіраваць сваімі часткамі і злучэннямі і шматлікія іншыя фактары, якія паўплывалі на ход баявых дзеянняў у пачатковы перыяд вайны.

Безумоўна, велізарная віна ў тым, што здарылася, ляжыць на Ваенным Савеце ЗахАВА. З-за яго некампетэнтнасці, нерашучасці, нераспарадчасці, боязі прыняцця неадкладных рашэнняў акруга, якая мела дастатковую колькасць гатовых да бою кадравых злучэнняў, што налічвала ў сваім складзе каля 4000 танкаў, больш 10 000 прылад і мінамётаў, каля 2000 баявых самалётаў, не змагла супрацьстаяць суперніку, які меў нашмат менш баявой тэхнікі.

Камандаванне акругі не зрабіла шмат з таго, што яно павінна было і магло зрабіць на тэрыторыі сваёй акругі. Камандаванне ЗахАВА ўвесь час дзейнічала, азіраючыся на думку НКА і ГШ Чырвонай Арміі. Нават у апошнія гадзіны перад пачаткам баявых дзеянняў, атрымліваючы трывожную інфармацыю з мяжы пра становішча, якое там складвалася, яно спакойна адпачывала ў тэатрах ці сядзела ў штабе, чакаючы ўказанняў з Масквы. Вось і быў змарнаваны такі неабходны час для прыняцця нейкіх рашэнняў у мэтах падвышэння баявой гатоўнасці даручаных камандаванню ЗахАВА войскаў.

Непадрыхтаванасць аператыўных дзяжурных усіх ступеняў, дзяжурных змен камандных пунктаў да прыёму баявых сігналаў і да выразных дзеянняў пры абвяшчэнні баявой трывогі прывяло да неабгрунтаванай страты часу пры атрыманні «наконец-то» сігналу на прывядзенне войскаў у баявую гатоўнасць.

Вельмі шмат невыразных распараджэнняў і ўказанняў, атрыманых войскамі Заходняй акругі перад пачаткам баявых дзеянняў, не маюць адказу і да гэтага часу:

- забарона на рассяроджванне авіяцыі ЗахАВА перад вайной;
- выняцце боекамплектаў з дотаў, танкаў і здача іх на склады;
- указанне на прасушку паліўных бакаў самалётаў;
- загад на выняцце з памежных застаў аўтаматычнай зброі для агляду і шмат што іншае;
- паведамленне ў памежныя часткі пра пралёт праз мяжу вялікіх груп нямецкіх самалётаў і забарону на вядзенне па іх агню.

З пачаткам баявых дзеянняў камандаванне фронтам, арміямі аддавала распараджэнні і загады, у якіх не ўлічвалася абстаноўка, што склалася на фронце; загады ў войскі не траплялі, а калі і траплялі, то з вялікай затрымкай і не адпавядалі сітуацыі на той час.

Сувязь была страчана літаральна з першых хвілін вайны. Вайсковая сувязь грунтавалася да вайны на тэлеграфных і тэлефонных сетках грамадзянскіх ліній. Уся сістэма сувязі памежных раёнаў была вядомая суперніку, вось і засталося камандаванне фронту і войскаў з пачаткам баявых дзеянняў без сувязі, а значыць, і без кіравання сваімі войскамі.

Бяздумная тактыка вядзення баявых дзеянняў, спробы ў любым выпадку бесперапынна контратакаваць суперніка не прыносілі чаканых вынікаў, вялі да значных страт нашых войскаў, што аслабляла абаронных магчымасці частак; бесперапыннае ўзаемадзеянне паміж родамі і відамі войскаў не было арганізавана; у бой кідалася ўсё, што было пад рукой, рэзервы фронту ўступалі ў бой разрозненa і значнай пагрозы для суперніка не ўяўлялі.

Стралковыя часткі перад вайной не навучаліся барацьбе з танкамі, ускладаючы гэту задачу на артылерыю.

Авіяцыя дзейнічала па прынцыпе «ўсе ў паветра», зусім забываючы пра прыкрыццё сваіх аэрадромаў; мела месца адсутнасць масіраванага ўжывання авіяцыі па адной цэлі (валодаючы значнай колькасцю бамбавікоў, можна было распачаць налёт усімі сіламі авіяцыі Заходняга фронту на адну цэль — танкавую групу, з далейшым пераносам на іншыя важныя цэлі. Замест гэтага авіяцыя дзейнічала па шматлікіх наземных цэлях дробнымі групамі і значных страт суперніку, вядома, нанесці не магла).

Не аказалі дзейснай дапамогі і дасланыя Стаўкай Галоўнага Камандавання прадстаўнікі — Маршалы Савецкага Саюза Б.М. Шапашнікаў, К.Е. Варашылаў, Г.І. Кулік.

Стварaецца ўражанне, што СССР не быў разгромлены толькі дзякуючы шчаслівай выпадковасці. Аднак савецкія і германскія дакументы і даследаванні паказваюць, што справы ішлі нашмат складаней. Акрамя таго, падзеі на савецка-германскім фронце ў другой палове 1941 года аказалі вялізнае ўздзеянне на развіццё сітуацыі ўсёй Другой сусветнай вайны, якая завяршылася крушэннем усіх стратэгічных разлікаў германскага кіраўніцтва.

ЦІКАВА

# ЧЫМ УРАЗІЛА ЛЕТА

## ТРАГЕДЫЯ Ў ОСЛА ЯК «СВЯТА, ЯКОЕ ЗАЎСЁДЫ З ТАБОЮ»

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**У культурным жыцці лета — традыцыйна мёртвы сезон. Але лета–2011 — як маё персанальнае, так і маёй краіны — выдалася надзіва жывым. Насуперак таму, што менавіта ўлетку ў маладым веку пайшлі з жыцця мае сябар і сяброўка, а ў краіне выспеў хрусткі каштэль эканамічнага апакаліпсісу...**



Маё сачыненне на тэму «Як я прабавіла лета» магло б атрымацца вострасюжэтным. Можна было б расказаць, як напрыканцы чэрвеня ў адной з мінскіх кавярняў я пазнаёмілася з балгарскім паэтам Дзімітрам Кенаравым, не ведаючы яшчэ, што праз нейкі тыдзень яго пасадзяць у Мазырскую турму, а я буду абрываць тэлефон амбасады Балгарыі і ў выніку бяздзеяння гэтай установы ператваруся ў амбасаду Балгарыі сама, пазнаёмлюся з мамай Дзімітара ды яго сябрамі і пачну разумець гутарковую балгарскую.

Можна было б расказаць, як у пачатку ліпеня я прабавіла кароткі адпачынак на фамільным хутары на Броннай Гары, і мяне там угрыз фірмовы браннагорскі клешч, і як я лётала скардзіцца на яго ў Мінскую інфекцыйную бальніцу па вуліцы Крапоткіна. Пра тое, як напрыканцы ліпеня я не змагла сплысці ў чарговы байдаркавы паход з Валянцінам Акудовічам і даслала замест сябе па вадзе вядзерка баланэзы, якую паходнікі патрушчылі халоднай на першай жа стаянцы, не прычакаўшы, пакуль зварацца макароны.

Можна было б расказаць пра жніевеньскую падзею, да якой я ішла ўсё лета, — фінал конкурсу маладых літаратараў імені Чэслава Мілаша ў Вільні. Пра тое, як з намі ў Вільню прыехаў бойфрэнд адной з фіналістак — малады гісторык, які на праверку выявіўся блогерам з прыгожым нікам Агмень Сутнасці — прыхільнік балта-крывіцкай тэорыі беларускага энтагенезу, які гады два таму праславіўся сярод беларускіх пісьменнікаў тым, што памераў ім чарапы, даволі прафесійна вызначыўшы іх расавыя падвіды па фотаздымках з інтэрнэту. Пра тое, як, уведаўшы нікнэйм юнага арыйца, у знак павагі да яго жыццёвай пазіцыі фіналісты конкурсу да трэцяй ночы гарлалі пад дзвярыма яго пакою песні на ідыш.

Можна было б расказаць, як бязрадасна заканчваецца маё лета — з анучай у руках, з фарбай пад пазногцямі — у працэсе касметычнага рамонту на сядзібе Беларускага ПЭН-Цэнтру.

Але раскажу я пра тое, што адбывалася ўнутры мяне. Пра рэакцыю на падзеі, што найболып шакавалі ўлетку, — тэракт у Осла 21 ліпеня і арышт Алеся Бяляцкага 4 жніўня.

Шокам для мяне былі нават не самі навіны, якія нагадвалі сюжэт нейкага пачварнага трылера ў першым выпадку і фільмы з удзелам Джэймса Бонда ў другім, а рэакцыя на іх беларускіх карыстальнікаў інтэрнэту. Калі голас народу ў гэтых выпадках — голас Бога, то, баюся, я канчаткова зняверылася.

### (Не)харошы хлопец

Сітуацыя ў Осла вечарам 21 ліпеня праяснялася паступова — спярша мы даведаліся пра выбух у цэнтры гораду, бліжэй да ночы з Нарвегіі пачалі паведамляць пра страляніну на выспе Утоя. З гэтай нагоды вельмі пазнавальна пачытаць каментары да артыкула пра ўсё гэта на сайце «Нашай нівы». Як вядома, сайт НН практыкуе пастаяннае абнаўленне матэрыялу па выніках развіцця падзеяў — знакамітыя «онлайны». Дык вось, навіна рэдагавалася, а каментары пад ёй засталіся. Яны тычацца розных варыянтаў аднаго і таго ж тэксту, і з іх вынікае, што напачатку, калі не было вядома, хто «аўтар» тэракту, СМІ на інерцыі прыпісалі яго ісламістам. Каментатары на сайце НН (і на шэрагу іншых папулярных беларускіх парталаў) расквітнелі абурэннем і нянавісцю да мусульманаў і ўвогуле — да «гэтых чорных», што вельмі дзіўнай для народу, які сутыкаецца з жыхарамі, напрыклад, Усходу раз на тыдзень, і гэтая сустрэча, хутчэй за ўсё, адбываецца каля латка з прыправамі на Камароўцы. (Фантастычныя, трэба сказаць, прыправы. Няхай хоць адзін каментатар зробіць мне гэткую ж прыправу «для боклажан», якую змешвае ўзбекская цётачка з Камароўскага рынку — тады і падыскутуем).

Калі ж стала вядома, што «аўтар» смерцяў — блакітнавокі бландзін Андрэс Брэйвік, тон каментараў рэзка змяніўся на спачувальны: во, давяла набрыдзь харошага хлопца... Маўляў, праз тое, што ў Нарвегію панаехалі арабы, гаротны скандынаўскі Андрэйка пацягнуўся да зброі. Хлопец аўтаматычна (ненаўмысны сумны каламбур) абвяшчаўся харошым — блакітнавокі бландзін у свядомасці абывателя не можа быць падонкам. Выходзіць, што калі страляе араб, ён па азначэнні нехарошы пацан. Калі ж страляе еўрапеец, ён па азначэнні пацан харошы, і рабіць нехарошыя рэчы яго змусілі выключна абставіны.

### Новае свята

Здаецца, 21 ліпеня «дзякуючы» нарвежскаму беспрацоўнаму, у цэлага фронту свядомых беларусаў з'явілася новае нацыянальнае свята. Безназоўнае, латэнтнае — гэткае свята-заўсёды-з-табою. Свята ўсведамлення таго, што «чорных», ці, правільней, за лаяльнасць да «чорных», дзесьці ў свеце масава забіваюць. Беларускія традыцыяналісты вокамгненна начапілі партрэт Брэйвіка на іканастас — поруч з адкапаным з мулу крыху пазней Расонскім ідалам. Іншы нарвежскі беспрацоўны і па сумяшчальніцтве беларускі паэт Славамір Адамовіч нават заявіў у інтэрв'ю «Радыё Палонія», што «Брэйвік — нармальны, адэкватны грамадзянін». І адзінай памылкай маладзёна было тое, што перад тым, як выправіцца на масакру, ён не перагаварыў з ім — Адамовічам. Бо наш Адамовіч, у прынцыпе, верыць ва ўсё тое самае, толькі змагаецца з нарвежскімі эмігрантамі (не, вы што, не такімі, як ён, — іншымі) спрадвечным Словам.

Дзмітры Гурневіч, які гутарыў з Адамовічам, не мог, як прафесіянал, не ўзяць для раўнавагі другое інтэрв'ю — у жыхара Швецыі журналіста і літаратара Дзмітрыя Плакса. Плакс стаўся добрым апанентам Чалавеку-Які-Зашыў-Сабе-Губу, але, у прынцыпе, сказаў дзяжурныя словы прыстойнага еўрапейскага ліберала. Пра крызіс еўрапейскага лібералізму з нагоды вычыну Брэйвіка не змаўчаў нават стары Славой Жыжэк, які назваў еўрапейскі лібералізм «кавай без кафеіну». Паводле Жыжэка, сярэдні еўрапейскі ліберал разважае наступным чынам: «Хай іншыя будуць, я іх паважаю, толькі хай яны не ўрываюцца на маю асабістую тэрыторыю. Як толькі яны гэта робяць, яны пачынаюць пераследаваць мяне — сваімі пахамі, нячыстай мовай, вульгарнымі манерамі, сваёй музыкай, кухняй ... Я цалкам падтрымліваю чарнаскурых, але я ніякім чынам не гатовы слухаць гучны рэп».

### Найлепшая кніга Беларусі

Што да Еўропы, то, у прынцыпе хоць неяк супакоіў Лёлік Ушкін, які паведаміў ў мінулым нумары «НЧ» пра рэзкае падзенне ў Еўропе рэйтынгу правых партыяў і пра тое, што кіраўнікам гэтых партыяў цяпер даводзіцца праяўляць цуды казуістыкі, каб размежаваць свае перакананні і маніфесты Брэйвіка. Усе пагаджаюцца на тым, што для добрага хрысціяніна павінна быць зразумелым: смерць — гэта смерць, і, у прынцыпе, зусім няважна, якую з ідэалагічных камбінацый («люблю геяў, але ненавіджу арабаў», «люблю арабаў, але ненавіджу геяў») вызнае забойца.

Што да Беларусі, то тут спакою няма. Увесь 2011 год шалёным, як на беларускі кнігадрук, попытам, карыстаўся раман «галоўнага расіста айчыннай прозы», «гуру праварадыкалаў» Юрыя Станкевіча «П'яўка». Галоўны герой гэтага рамана ў сваёй недалёкай будучыні займаецца тым жа, чым і Андрэс Брэйвік увечары 21 ліпеня, — адстрэльвае тых, каго лічыць недачалавекамі. «П'яўка» рэкламавалася яе выдаўцом як «найлепшая кніга 2010 года», а ўсё тыя ж каментатары ў сецыве аднагалосна заяўлялі, што кніга «чытаецца на адным дыханні». Я сама з жахам і агідай кінула гэтае чытво на 75-й старонцы, агаломшаная тым, што дыхаю са сваім народам нагэтулькі не ва ўнісон. У інтэрнэт-рэцэнзіях кнігу рашуча раскрытыкавалі толькі... маладыя літаратары, фіналісты ПЭН-цэнтраўскіх конкурсаў. Але што з іх возьмеш — яны вунь і песні на ідыш начамі гарлаюць.

Што да арышту Алеся Бяляцкага, у чужую для мяне сферу нюансаў міжнароднага падаткаабкладання я залазіць не буду. Адно толькі выказваю спадзяванні, што ва ўсіх вас, хто праваабаронцу Алеся Бяляцкага катэгарычна асудзіў і пракляў за ўсе яго літоўскія рахункі, не надарыцца нагоды патрабаваць даведку аб падатках ад тых спагадлівых незнаёмцаў, якія гэтай восенню ў выпадку арышту ні за што пасярод вуліцы перададуць вам за краты зубную шчотку і мыла.

**Тэкст удзельнічаў у перадачы «Дзень блогера: як я правёў лета» на сайце www.svaboda.org.**

КІНО

# НУДНЫЯ ГУЛЬНІ З ФАТУМАМ

Андрэй КРЫНІЦЫН

**На беларускіх экранах з'явілася пятая частка змагання падлеткаў са смерцю. «Пункт прызначэння 5» у стэрэавымярэнні.**

Дзесяць гадоў таму з'явілася карціна «Пункт прызначэння», якая ўдала злучыла фільмы катастрофаў, містыку і падлеткавыя хорары. Герой стужкі прадчуваў катастрофу на самалёце, панікаваў і выратоўваўся з асобнымі сябрамі. Але падлеткі заставаліся ў спісе смерці. Кірпатая не аддавала сваю здабычу так — і выкошвала людзей па спісе.

З серыі ў серыю гісторыя паўтаралася: спачатку была катастрофа самалёта, потым дадалася аўтаавварыя, меліся маляўнічыя смерці ў парку атракцыёнаў — і розныя варыяцыі злавеснага спісу. (У сённяшняй карціне — абвал мосту). Фільмы ўпарта палохалі гледачоў няспраўнымі электрапрыборамі, падвешанымі шматтоннымі плітамі і казалі — непераканаўча — пра часовасць жыцця.

Надалей стужкі засяродзіліся на атракцыёнах смерці, дзеля чаго быў нават засвоены фармат 3D.




У параўнанні з апошнімі выпускамі адчуваецца спроба надаць хоць нейкія псіхалагічныя абгрунтаванні паводзінам персанажаў. Мающца намёкі на гумар (чорны). Героі карціны носяць прозвішчы акцёраў і рэжысёраў страшнага кіно. А дзеля большай пераканаўчасці ў стужку зноў уведзены акцёр Тоні Тод, які, як і ў першых частках, сыграў патолагаанатама-філосафа. Усё гэта не зрабіла карціну мастацкай з'явай, але «смяротных» атракцыёнаў хопіць яшчэ на колькі частак.

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 926

Падпісана да друку 02.09.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.